ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

28 ЧЭРВЕНЯ 1936 Г., НЯДЗЕЛЯ | № 146 (5520)

РАБОТНІКАМ ЗАЛАТОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Вітаю з прычыны датэрміновага сканчэння поўгадавога плана.

Спадзяюся, што з поспехам закончыце план усяго года і дасце найлепшыя якасныя паказальнікі.

І. СТАЛІН.

Сталінскія клопаты аб чалавеку

Месяц назад 26 мая 1936 года Ўрад Совецкага Саюза перадаў на шырокае абмеркаванне працоўных праект закона аб забароне абортаў, дапамозе рожаніцам, расшырэнні сеткі радзільных дамоў, яслей і т. д. Гэта было актам найвялікшага палітычнага значэння. Гэта было магчыма толькі ў нашай краіне, у якой уводзіцца самая дэмакратычная ў свеце сталінская Канстытуцыя, у якой урад і народ прадстаўляюць сабой адзінае цэлае.

Праект закона аб забароне абортаў абмяркоўваўся мільёнамі працоўных совецкай краіны. На заводах, у цэхах, на калгасных сходах, у кожнай сям'і ўдумліва і сур'ёзна гаварылі аб праекце новага закона. Працоўныя ўносілі свае папраўкі і дапаўненні. І совецкі народ, грунтуючыся на грандыёзных перамогах соцыялізма, якія даюць небывалыя магчымасці матэрыяльнага забеспячэння мацеры і дзіцяці, сказаў сваё слова.

Сёння апублікоўваецца закон аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам, устанаўленні дзяржаўнай дапамогі многасямейным, расшырэнні сеткі радзільных дамоў, дзіцячых яслей і дзіцячых садоў, узмацненні крымінальнага пакарання за няўплату аліментаў і аб некаторых зменах у заканадаўстве аб разводах. Совецкі ўрад улічыў пры зацвярджэнні гэтага важнейшага закона заўвагі, унесеныя грамадзянамі пры абмеркаванні законапраекту.

Калі ў 1920 годзе совецкая ўлада дазволіла рабіць аборты, совецкі ўрад разглядаў гэта, як часовую з'яву, бо «маральныя перажыткі мінулага і цяжкія эканамічныя ўмовы сучаснага яшчэ прымушаюць частку жанчын адважвацца на гэту аперацыю» (з пастановы Народнага камісарыята аховы здароўя і Народнага камісарыята юстыцыі).

Наша краіна тады толькі выходзіла з грамадзянскай вайны, з ціскоў блакады і інтэрвенцыі. Нас хацелі задушыць кастлявай рукой голаду. Жорсткая эканамічная разруха стварала цяжкія жыццёвыя ўмовы, пры якіх частка жанчын была вымушана ісці на аборт, нават усведамляючы ўсю небяспеку для свайго здароўя і жыцця гэтай аперацыі.

Велізарны шлях прайшла з таго часу наша краіна.

Соцыялізм перамог у нашай краіне канчаткова і беспаваротна. Мы маем велізарны рост матэрыяльнага дабрабыту працоўных горада і вёскі, небывалы палітычны і культурны ўздым усяго совецкага народу.

Соцыялістычны лад, сталінская Канстытуцыя дае кожнаму грамадзяніну Совецкага Саюза права на працу, на адпачынак, на асвету, на забеспячэнне ў старасці, прадастаўляе жанчыне роўныя правы з мужчынай ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця. «— Магчымасць ажыццяўлення гэтых праў жанчын забяспечваецца прадастаўленнем жанчыне роўнага з мужчынай права на працу, аплату працы, адпачынак, соцыяльнае страхаванне і асвету, дзяржаўнай аховай інтарэсаў мацеры і дзіцяці, прадастаўленнем жанчыне пры цяжарнасці адпускоў з захаваннем утрымання, шырокай сеткі радзільных дамоў, дзіцячых яслей і садоў» (з праекта Канстытуцыі СССР).

Ні ў адной краіне ў свеце жанчына не знаходзіцца ў такіх умовах, як у Совецкім Саюзе.

Ні ў адной краіне ў свеце жанчына не мае і не можа мець такой поўнай магчымасці адмовіцца ад абортаў, якія калечаць жанчыну, падрываюць яе здароўе, пазбаўляюць яе назаўсёды магчымасці пазнаць радасць мацярынства, а часта прыносяць смерць.

Лепшым доказам гэтага з'яўляецца тое, што ў Совецкім Саюзе прырост насельніцтва ва многа раз перавышае прырост насельніцтва ва ўсіх капіталістычных краінах, складаючы каля трох мільёнаў чалавек штогод.

Новы закон устанаўляе дадатковыя матэрыяльныя ільготы мацерам, уводзячы значную грашовую дапамогу для многадзетных сем'яў, павялічваючы дапамогу па соцыяльнаму страхаванню. Жанчыны-служачыя атрымліваюць як да родаў, так і пасля родаў аднолькавы водпуск з работніцамі. Совецкая дзяржава адпускае велізарныя сродкі на будаўніцтва і ўтрыманне радзільных дамоў, яслей і дзіцячых садоў.

Кожная жанчына можа быць спакойна за лёс свайго дзіцяці, якое ўсёй сілай закона ахоўвае наша соцыялістычная дзяржава. Кожная жанчына можа спакойна пазнаць радасць і шчасце мацярынства, ведаючы, што совецкая ўлада стаіць на варце свяшчэнных інтарэсаў мацеры і дзіцяці.

Краіне соцыялізма патрэбна моцнае, здаровае пакаленне. Новы закон умацоўвае совецкую сям'ю, наносіць рашучы ўдар лёгкадумным адносінам да шлюбу.

Шчаслівы народ нашай шчаслівай краіны з пачуццём велізарнай удзячнасці, адданасці і любві да **Сталіна,** партыі, совецкага ўрада сустракае гэты, абмеркаваны і ўхвалены ім, закон, у якім ярка адлюстраваны велізарныя перамогі соцыялізма, сталінская мудрасць і сталінскія клопаты аб чалавеку.

◆

Калектыў БДТ-І на прыёме ў тав. ГІКАЛО

Учора сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало** прыняў калектыў Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра, які вярнуўся з гастрольнай паездкі па абслугоўванню сплаўшчыкаў і калгаснікаў аддаленых раёнаў рэспублікі.

На прыёме прысутнічалі тт. **Валковіч, Шусцін, Готфрыд, Конін і Пасюкевіч.**

У ажыўленай гутарцы акторы і рэжысёры тэатра расказалі аб праробленай рабоце, выключнай цікавасці, з якой сустрэлі тэатр сплаўшчыкі. Выказаліся т. **Гаеўскі**—дырэктар тэатра, тав. **Літвінаў** — мастацкі кіраўнік тэатра, заслужаны артыст рэспублікі т. **Владамірскі,** рэжысёр **Рахленка, Галіна, Міронава, Платонаў, Данілаў** і інш.

У канцы гутаркі з вялікай прамовай выступіў тав. **Н. Ф. Гікало.** Тав. Гікало падрабязна спыніўся на значэнні праробленай тэатрам работы і на задачах, якія стаяць перад тэатрам.

◆

ЗАЛАТАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ВЫКАНАЛА ПОЎГАДОВЫ ПЛАН

МАСКВА, 27 чэрвеня. (БЕЛТА). У рэзультаце напружанай работы ў маі і чэрвені, умацавання і развіцця стаханаўскага руху 27 чэрвеня выканан павялічаны поўгадавы план золатаздабычы па ўсёй залатой прамысловасці.

Прырост золатаздабычы ў першым паўгоддзі 1936 года раўняецца 25 проц. да адпаведнага перыяда мінулага года.

Залатая прамысловасць з 1 мая працавала па новых нормах, прадукцыйнасць працы ўзрасла да адпаведнага перыяда мінулага года на 39 проц.

Аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам, устанаўленні дзяржаўнай дапамогі шматсямейным, расшырэнні сеткі радзільных дамоў, дзіцячых яслей і дзіцячых садоў, узмацненні крымінальнага пакарання за неплацеж аліментаў і аб некаторых зменах у заканадаўстве аб разводах

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя, паклаўшая пачатак знішчэнню ўсякай класавай эксплаатацыі, знішчэнню саміх класаў, адначасова паклала пачатак поўнаму і канчатковаму вызваленню жанчын.

Ні ў адной краіне ў свеце жанчына не карыстаецца такім поўным роўнапраўем ва ўсіх галінах палітычнага, грамадскага жыцця і ў сямейным быту, як у СССР.

Ні ў адной краіне ў свеце жанчына, як маці і грамадзянка, на якой ляжыць вялікі і адказны абавязак нараджэння і выхавання грамадзян, не карыстаецца такой павагай і абаронай закона, як у СССР.

Аднак, наступіўшая ў першыя гады пасля грамадзянскай вайны і ўзброенай інтэрвенцыі эканамічная разруха ў краіне і атрыманая ў спадчыну ад дарэвалюцыйнай эпохі недастатковасць культурнага ўзроўню жанчын не дазволілі ім адразу-ж поўнасцю скарыстаць прадастаўленыя законам правы і без апасення за будучае выконваць свае абавязкі грамадзянкі і мацеры, адказнасць за нараджэнне і першапачатковае выхаванне сваіх дзяцей. У сувязі з гэтым совецкая ўлада дазволіла 18 лістапада 1920 года ўтварэнне абортаў (штучны перарыў цяжарнасці) для жанчын пакуль, як пісаў Народны камісарыят аховы здароўя і Народны камісарыят юстыцыі, «маральныя перажыткі мінулага і цяжкія эканамічныя ўмовы цяперашняга яшчэ прымушаюць частку жанчын адважвацца на гэту аперацыю» («З. У» № 90 арт. 471).

Ленін яшчэ ў 1913 годзе пісаў, што свядомыя рабочыя — «безумоўныя ворагі неамальтузіянства, гэтай плыні для мяшчанскай парачкі, заскарузлай і сябелюбівай, якая мармыча спалохана: самім-бы, дай бог, пратрымацца як-небудзь, а дзяцей ужо лепш непатрэбна».

Але паўстаючы супроць аборту, як соцыяльнага зла, Ленін лічыў яўна недастатковымі для барацьбы з ім толькі забараняючыя аборт законы. Больш таго, ён указваў, што ва ўмовах капіталізма гэтыя законы толькі адлюстроўваюць «двудушнасць пануючых класаў», бо яны «не вылечваюць балячак капіталізма, а ператвараюць іх у асабліва злаякасныя, асабліва цяжкія для прыгнечаных мас». (Т. XVI, стар. 498—499).

Толькі ва ўмовах соцыялізма, дзе адсутнічае эксплаатацыя чалавека чалавекам і дзе жанчына з'яўляецца поўнапраўным членам грамадства, а прагрэсуючае павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных з'яўляецца законам грамадскага развіцця, — можна сур'ёзна паставіць барацьбу з абортамі, у тым ліку і шляхам забарончых законаў.

Знішчэнне капіталістычнай эксплаатацыі ў СССР, рост матэрыяльнага дабрабыту і гіганцкі рост палітычнага і культурнага ўзроўню працоўных дазваляюць паставіць пытанне аб пераглядзе пастановы Наркамата аховы здароўя і Наркамюста ад 18 лістапада 1920 года.

Неабходнае матэрыяльнае забеспячэнне жанчын і іх дзяцей, дзяржаўная дапамога шматсямейным, максімальнае развіццё сеткі радзільных дамоў, дзіцячых яслей, дзіцячых садоў, заканадаўчае ўстанаўленне мінімуму сум, падлягаючых уплаце бацькам дзіцяці на яго ўтрыманне пры раздзельным жыцці супругаў, з аднаго боку, і забарона абортаў — з другога, разам з узмацненнем пакарання за злосны неплацеж прысуджаных судом сродкаў на ўтрыманне дзяцей і ўнясеннем некаторых змен у заканадаўства аб разводах, у мэтах барацьбы з лёгкадумнымі адносінамі да сям'і і сямейных абавязкаў, — такавы шляхі, на якія трэба стаць для вырашэння гэтага вялікага, закранаючага ўсё насельніцтва пытання. У гэтых адносінах совецкі ўрад ідзе насустрач шматлікім заявам працоўных жанчын.

У сувязі з вышэйзназначаным і ўлічваючы некаторыя заўвагі, зробленыя грамадзянамі пры абмеркаванні праекта, ЦВК і СНК Саюза ССР **пастанаўляюць:**

I

АБ ЗАБАРОНЕ АБОРТАЎ

1. У сувязі з устаноўленай шкоднасцю абортаў, забараніць утварэнне такавых як у больніцах і спецыяльных лекавых установах, так і на даму ва ўрачоў і на прыватных кватэрах цяжарных. Утварэнне абортаў дапусціць выключна ў тых выпадках, калі працяг цяжарнасці прадстаўляе пагрозу жыццю або пагражае цяжкай шкодай здароўю цяжарнай жанчыны, а таксама пры наяўнасці цяжкіх захворванняў бацькоў, якія перадаюцца ў спадчыну, і толькі ў абстаноўцы больніц і радзільных дамоў.

2. За ўтварэнне абортаў па-за больніцамі ці ў больніцы, але з парушэннем указаных умоў, устанавіць крымінальнае пакаранне ўрачу, які робіць аборт, — ад аднаго года да двух год турэмнага зняволення, а за ўтварэнне абортаў у антысанітарнай абстаноўцы ці асобамі, не маючымі спецыяльнай медыцынскай асветы, устанавіць крымінальнае пакаранне не ніжэй трох год турэмнага зняволення.

3. За прымушэнне жанчын рабіць аборт устанавіць крымінальнае пакаранне — турэмнае зняволенне да двух год.

4. У адносінах цяжарных жанчын, якія робяць аборт у парушэнне ўказанай забароны, устанавіць, як крымінальнае пакаранне, грамадскае ганьбаванне, а пры паўторным парушэнні закона аб забароне абортаў — штраф да 300 рублёў.

II

АБ ПАВЕЛІЧЭННІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ ДЗЯРЖАВЫ РОЖАНІЦАМ І ЎСТАНАЎЛЕННІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДАПАМОГІ ШМАТСЯМЕЙНЫМ

5. У мэтах паляпшэння матэрыяльнага становішча рожаніц, як работніц, так і служачых, застрахаваных у органах соцыяльнага страхавання, павялічыць размер дапамогі, выдаваемай са сродкаў дзяржаўнага соцыяльнага страхавання на набыццё неабходных прадметаў догляду нованароджаных, — з 32 рублёў да 45 рублёў.

6. Павялічыць размер дапамогі, выдаваемай мацеры на кармленне дзіцяці, з 5 рублёў да 10 рублёў у месяц.

7. У адносінах незастрахаваных працоўных жанчын — членаў кааперацыйных арцелей і прадпрыемстваў —устанавіць выдачу ўказаных дапамог кааперацыйнымі касамі ўзаемадапамогі на тых-жа падставах.

8. Адмяніць абмежаванне, устаноўленае кодэксам законаў аб працы для жанчын-служачых (арт. 132), прыраўняўшы іх да жанчын-работніц па даўжыні водпуску, прадастаўляемага да і пасля родаў — па 56 дзён да родаў і 56 дзён пасля родаў.

9. Устанавіць крымінальнае пакаранне за адмаўленне ў прыёме на работу жанчын па матывах цяжарнасці, зніжэнне ім заработнай платы па тых-жа матывах, прадугледзеўшы ў законе абавязковасць захавання за цяжарнай жанчынай, адначасова з пераводам яе на больш лёгкую работу, ранейшай зарплаты з разліку апошніх 6 месяцаў работы.

10. Устанавіць дзяржаўную дапамогу шматсямейным мацерам, якія маюць 6 дзяцей, пры нараджэнні кожнага наступнага дзіцяці ў 2 тысячы рублёў штогод на працягу 5 год з дня нараджэння дзіцяці, а мацерам, якія маюць 10 дзяцей, — аднаразовую дзяржаўную дапамогу пры нараджэнні кожнага наступнага дзіцяці ў 5 тысяч рублёў і з другога года штогодную дапамогу ў 3 тыс. рублёў, выдаваемую на працягу наступных 4 год з дня нараджэння дзіцяці, з пашырэннем дадзенага артыкула закона і на тыя сем'і, у якіх к моманту выдання закона будзе адпаведная колькасць дзяцей.

III

АБ РАСШЫРЭННІ СЕТКІ РАДЗІЛЬНЫХ ДАМОЎ

Даручыць наркаматам аховы здароўя саюзных рэспублік:

11. У мэтах поўнага ахопу рожаніц гарадоў, прамысловых і раённых цэнтраў радзільнай дапамогай у спецыяльных радзільных дамах, пабудаваць і ўвесці ў эксплаатацыю к 1 студзеня 1939 года новых 11 тысяч радзільных ложкаў, з іх:

у 1936 г., дадаткова да запраектаваных па плану 1936 г. 4.200—2.000 ложкаў. У 1937 годзе — 4.000 ложкаў. У 1938 годзе — 5.000 ложкаў.

12. У мэтах павелічэння стацыянарнай радзільнай дапамогі рожаніцам у сельскіх мясцовасцях, пабудаваць і ўвесці ў эксплаатацыю 32 тыс. радзільных ложкаў, з іх за кошт дзяржаўнага бюджэту 16 тыс. ложкаў у радзільных аддзяленнях і пры сельскіх больніцах і 16 тыс. ложкаў шляхам арганізацыі калгасных радзільных дамоў, аднёсшы кошт іх арганізацыі ў 75 проц. — за кошт калгасаў і ў 25 проц. — за кошт дзяржаўнага бюджэту.

У тым ліку:

У 1936 годзе дадаткова да запраектаваных планам 1936 года — 4,3 тыс. радзільных ложкаў пры сельскіх больніцах і 5 тыс. радзільных ложкаў пры калгасных радзільных дамах, пры больніцах 4 тыс. ложкаў і пры калгасных радзільных дамах — 4 тыс. ложкаў.

У 1937 годзе пры больніцах — 6 тыс. ложкаў і пры калгасных радзільных дамах — 6 тыс. ложкаў.

У 1938 годзе пры больніцах — 6 тыс. ложкаў і пры калгасных радзільных дамах — 6 тыс. ложкаў.

13. У мэтах забеспячэння рожаніц, не абслужаных дапамогай радзільных дамоў — акушорскай дапамогай на даму — разгарнуць к 1 студзеня 1939 г. 14.400 новых акушорскіх пунктаў, з іх:

У 1936 годзе — 2.700 акушорскіх пунктаў на сяле і 1.370 акушорак пры новых калгасных радзільных дамах.

У 1937 годзе — 5.000 акушорскіх пунктаў на сяле і 2.000 акушорак пры новых калгасных радзільных дамах.

У 1938 годзе — 6.700 акушорскіх пунктаў на сяле і 2.000 акушорак пры новых калгасных радзільных дамах.

IV

АБ РАСШЫРЭННІ СЕТКІ ДЗІЦЯЧЫХ ЯСЛЕЙ

14. Падвоіць к 1 студзеня 1939 года існуючую сетку ясельных ложкаў для дзяцей па гарадах, соўгасах, рабочых пасёлках і на чыгуначным транспарце, давёўшы іх агульную колькасць да 800 тыс. ложкаў, пабудаваўшы і ўвёўшы ў эксплаатацыю:

У **1936** годзе дадаткова да запраектаваных па плану 1936 г. 34 тыс. ложкаў — 100.000 новых ложкаў. У **1937** г. — 150.000 новых ложкаў. У **1938 г.** — 150.000 новых ложкаў. Усяго 400.000 новых ложкаў.

15. У сельскіх мясцовасцях падвоіць к 1 студзеня 1939 года існуючую сетку ясельных ложкаў як у пастаянных, так і сезонных калгасных яслях, павялічыўшы колькасць ложкаў у пастаянных яслях на 500 тыс. і ў сезонных — на 4 мільёны ложкаў, з іх:

У **1936** г. у пастаянных калгасных яслях дадаткова да запраектаваных па плану 1936 г. 70 тыс. ложкаў — 100 тыс. ложкаў.

У сезонных яслях, дадаткова да запраектаваных у 1936 г. 1 млн. ложкаў — 500.000 ложкаў.

У **1937** г. у пастаянных калгасных яслях — 200 тыс. ложкаў. У сезонных яслях — 1.500 тыс. ложкаў.

У **1938** г. у пастаянных калгасных яслях — 200 тыс. ложкаў.

У сезонных яслях — 2 млн. ложкаў.

Нагляд за разгортваннем указанай сеткі ўскласці на наркаматы аховы здароўя саюзных рэспублік і краявыя, абласныя і раённыя выканаўчыя камітэты.

16. У гарадах і прамысловых мясцовасцях са студзеня 1937 г. работу ў яслях праводзіць у дзве змены, на працягу 16 гадзін у суткі, уключаючы выходныя дні.

17. Прапанаваць наркаматам аховы здароўя саюзных рэспублік забяспечыць нова-адкрываемыя ўстановы адпаведнымі кадрамі, дадаткова адпусціўшы на падрыхтоўку сярэдне-медыцынскага персанала да асігнаванняў 1936 года — 15 млн. рублёў.

18. Прапанаваць наркаматам аховы здароўя саюзных рэспублік пабудаваць дадаткова на працягу трох год — к 1 студзеня 1939 года — 800 новых малочных кухань у гарадах, прамысловых і раённых цэнтрах для харчавання дзяцей да 3-гадовага ўзросту, ахапіўшы снабжэнне з гэтых кухань 1,5 млн. дзяцей і разгарнуўшы:

У **1936** г. 30 кухань першай катэгорыі (коштам кожная кухня 83 тыс. рублёў).

100 кухань другой катэгорыі (коштам кожная кухня 65 тыс. рублёў).

У **1937** г. 70 кухань першай катэгорыі,

200 кухань другой катэгорыі.

У **1938** г. 100 кухань першай катэгорыі,

300 кухань другой катэгорыі.

V

АБ РАСШЫРЭННІ СЕТКІ ДЗІЦЯЧЫХ САДОЎ

19. Патроіць на працягу трох год існуючую сетку стацыянарных дзіцячых садоў у гарадах, фабрычна-заводскіх пасёлках і на чыгуначным транспарце, давёўшы яе (супроць 700 тыс. месц існуючай сеткі дзіцячых садоў) — на 1-е студзеня 1939 года да 2.100 тыс. месц і па соўгасах, прадпрыемствах і ўстановах у сельскіх мясцовасцях да 300 тыс. месц супроць 130 тыс. месц існуючай сеткі, для чаго пабудаваць і ўвесці ў эксплаатацыю:

У **1936** г. па гарадах, фабрычна-заводскіх пасёлках і на чыгуначным транспарце — дадаткова да 250 тыс. месц, запраектаваных па плану 1936 года, яшчэ — 150 тыс. месц.

У соўгасах і на прадпрыемствах і ўстановах у сельскіх мясцовасцях план павелічэння дзіцячых садоў на 1936 год пакінуць ранейшы — 60 тыс. месц. (Усяго — 190 тыс. месц).

У **1937** г. па гарадах, фабрычна-заводскіх пасёлках і на чыгуначным транспарце — 300 тыс. месц.

Па соўгасах і на прадпрыемствах і ўстановах у сельскіх мясцовасцях — 60 тыс. месц.

У **1938** г. па гарадах, фабрычна-заводскіх пасёлках і на чыгуначным транспарце — 700 тыс. месц.

Па соўгасах і на прадпрыемствах, установах у сельскіх мясцовасцях—50 тыс. месц.

20. К 1 студзеня 1939 года разгарнуць стацыянарныя дзіцячыя сады ў калгасах, дадаткова да існуючай сеткі ў 400 тыс. месц, яшчэ на 700 тыс. месц, увёўшы ў эксплаатацыю:

У **1936** г. дадаткова да запраектаваных на 1936 г. 150 тысяч — 50 тыс. месц. (Усяго 200 тысяч месц).

У **1937** г. — 240 тыс. месц.
У **1938** г. — 260 тыс. месц.

У той-жа тэрмін ахапіць дзіцячымі сезоннымі дашкольнымі пляцоўкамі ўсіх дзяцей у калгасах, для чаго разгарнуць:

У **1936** годзе (згодна плана 1936 года) — 4.500 тыс. месц.

У **1937** годзе — 7.800 тыс. месц.

У **1938** годзе — 10.700 тыс. месц.

Нагляд за разгортваннем сеткі дзіцячых садоў і дзіцячых дашкольных сезонных пляцовак у сельскіх мясцовасцях ускласці на наркаматы асветы саюзных рэспублік і краявыя, абласныя і раённыя выканаўчыя камітэты.

21. Абавязаць наркаматы асветы саюзных рэспублік ужо ў другую палову 1936 года падрыхтаваць 50 тыс. выхаваўцаў для гэтых нова-адкрываемых садоў, адпусціўшы для гэтай мэты дадаткова да асігнаванняў 1936 года на падрыхтоўку кадраў для новых дзіцячых садоў па каштарысах наркаматаў асветы саюзных рэспублік — **35 млн. руб.**

VI

АБ ЗМЕНЕ ПАРАДКУ КІРАЎНІЦТВА ДЗІЦЯЧЫМІ САДАМІ

22. Змяніць пастанову Соўнаркома Саюза ССР ад 6 ліпеня 1935 г. («З. З.», № 35, арт. 309) аб сканцэнтраванні кіраўніцтва і ўпраўлення ўсімі дзіцячымі садамі ў сістэме наркаматаў асветы саюзных рэспублік, перадаўшы ў веданне гаспадарчых наркаматаў, устаноў і прадпрыемстваў тыя дзіцячыя сады, у якіх знаходзяцца дзеці рабочых і служачых гэтых устаноў і прадпрыемстваў, пакінуўшы ў веданні наркаматаў асветы толькі тыя дзіцячыя сады, якія абслугоўваюць дробныя ўстановы і прадпрыемствы, не маючыя сваіх садоў. Непасрэднае кіраўніцтва дзіцячымі садамі ўскласці на адміністрацыю прадпрыемства або ўстановы, пры якой знаходзіцца сад, з прыцягненнем фабрычна-заводскіх камітэтаў і комсамольскіх арганізацый гэтых прадпрыемстваў і ўстаноў. За наркаматамі асветы саюзных рэспублік захаваць агульнае педагагічнае кіраўніцтва, кантроль за правільнай пабудовай сеткі дзіцячых садоў і падрыхтоўку педагагічных кадраў.

Совету Народных Камісараў Саюза ССР вызначыць парадак перадачы і фінансавання дзіцячых садоў, а таксама і парадак будаўніцтва і фінансавання новых дзіцячых садоў, у сувязі з нова-устанаўляемай сістэмай кіраўніцтва і ўпраўлення дзіцячымі садамі.

VII

АБ ФІНАНСАВАННІ ВЫШЭЙУКАЗАНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

23. У адпаведнасці з данай пастановай, асігнаваць звыш ужо адпушчаных на 1936 год па дзяржаўнаму і мясцоваму бюджэтах і бюджэту соцыяльнага страхавання 1.481,3 млн. рублёў на радзільныя ложкі, акушорскія пункты, яслі, малочныя кухні і дзіцячыя сады дадаткова на 1936 год 692,8 млн. рублёў на будаўніцтва і разгортванне сеткі гэтых устаноў, давёўшы агульную суму асігнаванняў у 1936 годзе да 2.174,1 млн. рублёў супроць 875 млн. рублёў у 1935 г.

З указаных 692,8 млн. рублёў накіраваць на будаўніцтва:

а) радзільных ложкаў у гарадах—22,2 млн. рублёў;

б) радзільных ложкаў на сяле—23,8 млн. руб.;

в) дзіцячых ясель у гарадах — 320,0 млн. р.
г) дзіцячых садоў у гарадах—221,0 млн. р.
З залікам праведзенага 11-проц. скарачэння сабекошту будаўніцтва;

д) малочных кухань — 9,0 млн. рублёў.

Усяго на будаўніцтва 596,0 млн. рублёў.

На аператыўныя расходы:

а) на ўтрыманне новаадкрываемых радзільных ложкаў і акушорскіх пунктаў — 5 млн. руб.;

б) на ўтрыманне ў канцы 1936 года новапабудаваных дзіцячых яслей — 11,8 млн. рублёў;

в) на расшырэнне і паляпшэнне існуючай сеткі дзіцячых садоў шляхам скарыстання і прыстасавання пад дзіцячыя сады новай прадастаўляемай плошчы, веранд і іншых лёгкага тыпу памяшканняў у існуючых дзіцячых садах, правядзенне дробнага рамонту вызваляемых ад жыхароў памяшканняў — 30,0 млн. рублёў. Усяго 46,8 млн. рублёў.

На падрыхтоўку кадраў:

а) на падрыхтоўку кадраў акушорак і медсясцёр Наркамата аховы здароўя — 15 млн. рублёў;

б) на падрыхтоўку кадраў выхаванцаў гарадскіх дзіцячых садоў Наркомасветы — 17 млн. рублёў;

в) на падрыхтоўку кадраў выхаваўцаў сельскіх дзіцячых садоў Наркомасветы — 18 млн. рублёў.

Усяго 50 млн. рублёў.

24. Асігнаваць на павелічэнне радзільнай дапамогі рожаніцам у адпаведнасці з п. 5, 6 і 8 данай пастановы 70,5 млн. руб.

25. Совету Народных Камісараў Саюза ССР забяспечыць запраектаванае будаўніцтва неабходнымі будаўнічымі матэрыяламі з тым, каб наркаматы к 1 ліпеня г. г. маглі прыступіць да будаўніцтва.

26. У мэтах устанаўлення аднастайнага цвёрдага парадку фінансавання дзіцячых садоў і дзіцячых яслей, у змену пастановы Соўнаркома Саюза ССР ад 6 ліпеня 1935 года («З. З.», № 35 1935 г., арт. 310) «Аб абавязковых узносах прадпрыемстваў і ўстаноў на ўтрыманне дзіцячых яслей і дзіцячых садоў» у размеры адной чвэрці проц. к фонду зарплаты, — устанавіць на 1936 год прамое асігнаванне на гэту мэту з дзяржаўнага бюджэту ў суме 300 млн. рублёў, унёсшы адпаведныя змены ў фінансавыя планы гаспадарчых органаў і устаноў, а таксама ў даходную і расходную частку бюджэту дзяржаўнага соцыяльнага страхавання.

VIII

АБ УЗМАЦНЕННІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПАКАРАННЯ ЗА НЕПЛАЦЕЖ АЛІМЕНТАЎ І АБ ЗМЕНАХ У ЗАКОНАДАЎСТВЕ АБ РАЗВОДАХ

27. У змену існуючых законаў аб шлюбе, сям'і і апецы, у мэтах барацьбы з лёгкадумнымі адносінамі да сям'і і сямейных абавязкаў, устанавіць пры ўтварэнні разводу асабісты выклік у ЗАГС абодвух разводзячыхся супругаў і адзнаку ў пашпарце разводзячыхся — аб разводзе.

28. Павысіць аплату рэгістрацыі разводу ў размерах: першы развод — 50 рублёў, другі — 150 руб., трэці і наступныя — 300 руб.

29. Пры прысуджэнні аліментаў спаганяць на ўтрыманне аднаго дзіцяці ¼ атрымліваемай зарплаты адказчыка, на ўтрыманне двух дзяцей ⅓ і на ўтрыманне трох і больш — 50 проц. зарплаты адказчыка.

30. Для калгасніц вылічэнне рабіць у працаднях па тых-жа нормах.

Калі маці-калгасніца, якая атрымлівае аліменты, працуе з адказчыкам у адным калгасе, — абавязаць праўленне калгаса непасрэдна пры вылічэнні працадзён запісваць адпаведную частку выпрацаваных працадзён бацькі (у залежнасці ад наяўнасці дзяцей) на рахунак мацеры. Калі маці працуе ў іншым калгасе, — гэта пералічэнне на імя мацеры адпаведнай часткі выпрацаваных бацькам працадзён робіцца на імя мацеры праўленнем калгаса, дзе працуе адказчык, пры канчатковым падліку працадзён.

31. Павысіць крымінальнае пакаранне за неплацеж прысуджаных судом сродкаў на ўтрыманне дзяцей — да двух год турэмнага зняволення з аднясеннем расходаў па росшуку ўхіляючайся ад плацяжу аліментаў асобы за яе кошт.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР М. КАЛІНІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

В. а. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР І. УНШЛІХТ.

27 чэрвеня 1936 года
Масква, Крэмль.

ПАЛІТЫЧНАЯ ГЛУХАТА

(Ад беларускага карэспандэнта «Правды»)

Гісторыя, аб якой ідзе гутарка, вельмі павучальная. У мінулым годзе, калі пры ЦК КП(б)Беларусі стварaўся аддзел школы і навукі, загадчыкам аддзела быў назначан Арабей, які да гэтага працаваў кіраўніком Беларускага партыйнага выдавецтва. У сувязі з гэтым пленум ЦК КП(б)Б кааптаваў Арабея ў склад членаў ЦК КП(б)Беларусі. Было гэта ўвосень 1935 г.

Прайшло некалькі месяцаў. У студзені гэтага года на чарговым пленуме ЦК КП(б)Беларусі па некаторых меркаваннях рашылі ўвесці Арабея кандыдатам у члены бюро ЦК Беларусі. Калі гэта пытанне было пастаўлена на абмеркаванне пленума, выступіў сакратар Суражскага райкома партыі тав. Чундзераў з заявай, якая ашаламіла ўсіх прысутных:

— Памятаю, — гаварыў ён, — як Арабей у 1923 годзе на сходзе партыйнага актыва ў Менску актыўна і неаднаразова выступаў у абарону контррэвалюцыйнай платформы Троцкага.

Гэта было так нечакана, што ў зале наступіла гнятучае маўчанне. Стварылася ўражанне, быццам тут прысутнічаюць людзі, якія толькі ўчора прыехалі ў Беларусь. Але не, яны ўжо многа год працуюць у Беларусі.

Далі слова Арабею.

— Не ведаю нават што сказаць. Ніколі я супроць партыі не выступаў. Ніякіх грахоў за сабой супроць партыі не маю. Не разумею, чаму Чундзераў выступіў супроць мяне. Або гэта памылка, або паклёп.

Кой хто ўздыхнуў з палёгкай. Па адрасу Чундзерава пасылаліся неадабральныя, іранічныя рэплікі.

— Хто хоча выказацца?

Узяў слова член ЦК КП(б)Беларусі тав. А. В. Дубіна і рашуча заявіў:

— Я таварыша Арабея ведаю даўно. Ніколі ён супроць партыі не выступаў. Не разумею, адкуль ў Чундзерава такія весткі.

Усякія сумненні адпалі. Паспешна прагаласавалі. Арабей стаў кандыдатам у члены бюро ЦК КП(б) Беларусі. Нават не палічылі патрэбным устрымацца ад вырашэння гэтага пытання да расследвання трывожнага сігнала.

Праз некаторы час на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Беларусі спецыяльная камісія даложыла, што Арабей сапраўды у 1923 годзе актыўна абараняў контррэвалюцыянера Троцкага скрыў гэта ад партыі, ні пры чыстках, ні пры праверцы партыйных дакументаў аб гэтым не гаварыў.

На гэтым пасяджэнні бюро Арабей прызнаў сваю памылку, саслаўся і на забыўчывасць і на тое, што яго, моў, ніхто не пытаў аб такіх дэталях. Бюро адхіліла Арабея ад работы, рашыла вывесці яго са складу ЦК КП(б)Беларусі і папярэдзіла яго, што пры паўтарэнні падобных спраў ён паставіць сябе па-за радамі партыі.

На чарговым пленуме 24 чэрвеня гэта пытанне было зноў пастаўлена. Выступіў тав. Чундзераў з законным недаўменнем:

— Арабей абмануў партыю. Прад'яўленыя яму ва-ўпор абвінавачанні ў трацкізме ён адмаўляў. 13 год засаб ён аб гэтым партыі не гаварыў. А зараз яму за ашуканства партыі нават спагнання ніякага не вынеслі. Дарэчы, тав. Дубіна таксама ўвёў у заблуджэнне партыю і па сутнасці дапамог Арабею ашукаць пленум ЦК.

Дубіна выступіў з тлумачэннямі. Ён гаварыў не як кіраўнік - бальшэвік, а разважаў, як абывацель.

— Я абараняў Арабея таму, што не ведаў аб яго трацкісцкім мінулым. Каб я ведаў...

Тут-жа на пленуме адначасова выяснілася, што за Арабеем апрача трацкізма лічацца і праступкі нацыяналістычнага парадку.

За ўсе гэтыя антыпартыйныя справы, у тым ліку і за шматгадовае і ўпартае ашуканства партыі, пленум вывеў Арабея са складу ЦК і вынес яму суровую вымову з папярэджаннем.

Такім чынам, ашуканец партыі, які вадзіў за нос кіруючых работнікаў беларускай партарганізацыі, параўнаўча лёгка адзелаўся, захаваўшы партыйны білет. Бясспрэчна і тое, што тут да трывожнага сігнала комуніста не было праяўлена дастатковай партыйнай чуласці, дастатковай пільнасці.

Трэба напомніць і аб другім выпадку.

Доўгі час у рэдакцыі цэнтральнага органа ЦК Беларусі ў газеце «Звязда» на кіруючай рабоце сядзеў толькі нядаўна выкрыты трацкісцкі вырадак Розенблюм.

Як бачым, усебаковым веданнем людзей, сапраўды бальшэвіцкай пільнасцю ў Беларусі пахваліцца не могуць.

Ф. ВІГДАРОВІЧ.

(«Правда»).

АБМЕН ПАРТДАКУМЕНТАУ

Абмен партдакументаў па КП(б)Б набліжаецца да сканчэння. 85 проц. членаў і кандыдатаў партыі атрымалі новыя партдакументы. 75 раённых партарганізацый ужо закончылі поўнасцю абмен.

На 22 чэрвеня па 83 партарганізацыях гарадоў і раёнаў БССР выдана 21.899 партбілетаў і 7.521 кандыдацкая картка. Выключаны з партыі 524 члены і 473 кандыдаты, якія не апраўдалі высокага звання комуністаў. Пераведзена з членаў у кандыдаты 139 чалавек ў спачуваючыя 180 чалавек.

У бліжэйшыя дні будуць зацверджаны вынікі абмену па 20 раённых партарганізацыях.

Усю работу па абмену партдакументаў па партарганізацыях КП(б)Б мяркуецца закончыць да 25 ліпеня. (БЕЛТА).

ІНІЦЫЯТЫВА ПАРТОРГА ЛЯШКО

У мястэчку Леніна, побач з будынкамі сельсовета і праўлення калгаса, доўгі час стаяў поўразбураны домік і глядзеў на вуліцу старчымі вачыма выбітых шыб.

Аднойчы ў беспрытульны домік зайшлі парторг Ленінскай партыйна-кандыдацкай групы т. Ляшко і старшыня сельсовета т. Тройчынскі. Абмерылі, агледзелі ўсе куткі, доўга аб нечым раіліся і неўзабаве склікалі партыйны сход. На сходзе стаяла адно пытанне — аб закінутым доміку. Пастанова была кароткая — сіламі комуністаў і актыва зрабіць рамонт, здабыць належнае абсталяванне і стварыць тут партыйны габінет.

Ролю прараба ўзяў на сябе парторг т. Ляшко. Дываны, крэслы і другую мэблю здабыў старшыня сельсовета т. Тройчынскі. Радыёпрыёмнік даў у падарунак калгас імя Леніна.

Так быў пабудован партыйны габінет у мястэчку Леніна. Зараз сюды прыемна зайсці. Тут можна дастаць любы твор Леніна, «Пытанні ленінізма» Сталіна, літаратуру да партыйных заняткаў. Ёсць у габінеце і невялікая колькасць мастацкіх кніг. Партыйны габінет існуе толькі 2 месяцы. За гэты час тут праведзена параўнаўча вялікая работа. Сюды прыходзяць рыхтавацца да партыйных заняткаў члены і кандыдаты партыі. Тут вывучаецца са спачуваючымі статут і праграма партыі (апрача заняткаў у кандыдацкай школе, куды прымацаваны ўсе спачуваючыя).

Сіламі партыйна-кандыдацкай групы і мясцовага настаўніцтва праведзен рад дакладаў і гутарак з калгаснікамі на палітычныя і агульнакультурныя тэмы.

Слухаць па радыё лекцыі па гісторыі партыі збіраюцца не толькі комуністы. Настаўнікі, сельсовецкі і калгасны актыў, комсамольцы — усе з вялікай ахвотай слухаюць гэтыя перадачы.

Аднак Слуцкі райком партыі не надаў належнага значэння каштоўнай ініцыятыве партыйна-кандыдацкай групы Ленінскага сельсовета. Ніхто з райкома ў габінеце яшчэ не быў. Больш таго, ленінская партыйна-кандыдацкая група не абслугоўваецца ні адным з інструктароў райкома. Забылі на такую «дробязь».

А партыйны габінет патрабуе дапамогі. Пры адпаведным забеспячэнні літаратурай і сродкамі габінет мог-бы абслугоўваць не толькі калгас імя Леніна. Тут можна і трэба арганізаваць цэнтр партыйнай прапаганды і агітацыі для ўсіх калгасаў Ленінскага і суседніх сельсоветаў.

Неабходна толькі, каб райком змяніў сваю пазіцыю «нейтралітэту» у адносінах да добрай ініцыятывы таварышоў з мястэчка Леніна.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

УСЕНАРОДНАЕ АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТА КАНСТЫТУЦЫІ САЮЗА ССР

МАЕ ЗАУВАГІ

Мне ўжо 75 год. З іх я значную частку пражыў без усякіх правоў, за выключэннем аднаго толькі права, якім карысталіся такія-ж сяляне як і я—гэта ад святла да святла горбіць сваю спіну на графа Буценева, кулака Лаптнёва і на іншых, да іх падобных кровесмокаў.

Сапраўдную і поўную свабоду нам дала совецкая ўлада. Пры ёй мы, сяляне, сталі жыць сапраўды свабодна. Калгасны лад нам даў шчаслівае і раднае жыццё. Цяпер новая Канстытуцыя дае нам, калгаснікам, яшчэ больш шырокія правы.

Спадабаўся мне 10 раздзел аб асноўных правах і абавязках і асабліва артыкул 120, дзе прадугледжваецца матэрыяльнае забеспячэнне па старасці і 121, дзе даюцца поўныя правы на асвету. Вось я не меў у стары час магчымасці вучыцца. Так і застаўся непісьменным. Цяпер я ганаруся тым, што ўсе мае дзеці — граматныя людзі. Я ўжо не гавару аб маім сыне Аляксеі — герої-чэлюскінцу, які не толькі меў магчымасць вучыцца, а і свет пабачыць.

Старшы мой сын—Егор—працуе інструктарам райкома партыі ў Ленінградзе, ды апрача гэтага вучыцца на павышаных курсах. Другі сын—Сцяпан—працуе на тарфяным заводзе, за Віцебскам. А сын Антон — трактарыст. Дачка Клаўдзія скончыла сямігодку і працуе разам з братам Сцяпанам па тэхнічнай частцы.

Адзін дадатак я хачу зрабіць па 133 артыкулу. Поўнасцю згаджаюся з тым, што абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны доўг кожнага грамадзяніна СССР і з тым, што за здраду радзіме трэба сурова караць. Я прапаную, каб побач з гэтым артыкулам быў змешчан яшчэ адзін артыкул, які-б прадугледжваў залічэнне ў герої Совецкага Саюза тых, хто ў абароне бацькаўшчыны праяўляе самаадданае геройства.

Не згодзен я толькі з тым, што праект Канстытуцыі дае правы былым людзям — кулакам і асабліва духавенству. Я лічу, што гэтых людзей трэба ў правах абмежаваць, асабліва тых, якія яшчэ ўсё не могуць развітацца са сваім мінулым жыццём і адкрыта або ўкосна ўсяляк стараюцца пашкодзіць справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Я хоць і стары, але за такую Канстытуцыю, за такія клопаты аб нас таварыша Сталіна гатоў разам са сваім сынам-ордэнаносцам, са ўсёй сям'ёю стаць на абарону нашай горача любімай радзімы!

Калгаснік калгаса імя Чарвякова, Верхаўскага сельсовета, Бешанковіцкага раёна, Еўдакім Герасімавіч ХАРКЕВІЧ—бацька ордэнаносца-чэлюскінца Аляксея Еўдакімавіча Харкевіча.

Рабочыя бабруйскага фанернага завода ў час абедзенага перапынку чытаюць і абмяркоўваюць праект новай Канстытуцыі СССР. Фото Я. Салавейчыка.

ТУТ Я ЗНАЙШОЎ СВАЮ РАДЗІМУ

Я па нацыянальнасці кітаец, з горада Мукдэна. Мае бацькі займаліся земляробствам. Тут-жа капацца ў зямлі дапамагаў ім і я. З шаснаццаці гадоў я пайшоў на самастойную работу. Прыехаў ў Расію завербаваны фабрыкантамі, якія эксплаатавалі мяне аж да самай Кастрычніцкай рэволюцыі. Працоўныя скінулі фабрыкантаў і памешчыкаў. і я пайшоў добраахвотна ў Чырвоную армію, каб ахоўваць заваёвы Кастрычніка. У гэты час я адчуваў, што абараняю сваю радзіму—рабочых і сялян.

Уважліва слухаў я кожны пункт праекта сталінскай Канстытуцыі і бачу — наша Канстытуцыя — самая дэмакратычная ў свеце. Кожны працоўны нашай краіны мае небывалыя перспектывы багацейшага жыцця.

Я-б вельмі хацеў, каб такая ўлада і такая Канстытуцыя, як наша, была у Кітаі. Упэўнен, што гэта маё жаданне будзе ажыццёўлена.

Я працую забойшчыкам у кар'еры крычаўскага цэментнага завода. З'яўляюся стаханаўцам. Выконваю норму на 250—300 проц. За май месяц я зарабіў 685 руб. Мяне ўсе паважаюць. Жонка мая украінка. Жывём мы радасна, весела і заможна. Нашы дзеці сыты, абуты і апрануты.

За гэту радасць і заможнасць я дзякую сусветнаму правадыру працоўных народаў таварышу **Сталіну**, які даў нам такое жыццё!

ТУ-ОФУ Васіль,

рабочы-стаханавец крычаўскага цэментнага завода.

БУДЗЕМ ВЫХОЎВАЦЬ ПАКАЛЕННЕ СОВЕЦКІХ ПАТРЫЁТАЎ

Мы, група студэнтаў-выпускнікоў гомельскага педагагічнага інстытута, з пачуццём выключнай радасці і гордасці прачыталі праект Канстытуцыі СССР — велізарнейшы дакумент сталінскай эпохі. Наша новая Канстытуцыя — гэта Канстытуцыя дабрабыту, культуры, шчаслівага жыцця. Гэта — велізарнейшы вынік заваёў совецкай краіны на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

Мы адчуваем вялікую радасць: наш выпуск з інстытута супаў з усенародным абмеркаваннем праекта новай Канстытуцыі СССР. Мы шчаслівы тым, што нарадзіліся, жывем і будзем працаваць у вялікую сталінскую эпоху. Мы з радасцю ўступаем у армію совецкіх настаўнікаў, адчуваючы сябе падрыхтаванымі для ганаровай у нашай краіне педагагічнай работы. Працуючы ў школе, мы будзем вучыцца самі, каб быць карыснымі для соцыялістычнай радзімы. Мы ўсе свае сілы і веды аддадзім для выхавання пакалення совецкіх патрыётаў. Мы будзем выхоўваць у дзецях пачуцці гордасці за сваю прыгожую радзіму, адданасць партыі, пагарджэнне да труслівасці, нянавісць да ворагаў, стойкіх барацьбітоў і будаўнікоў комуністычнай грамадскасці.

Вялікае дзякуй таварышу **Сталіну** —твoрцу новай Канстытуцыі СССР. дзякуй за радаснае і шчаслівае жыццё! Мы ўносім прапановы: у артыкуле 121-м увесці ўсеагульную абавязковую асвету за няпоўную сярэднюю школу, а таксама забяспечыць сістэмай дзяржаўных стыпендый большасць вучняў старэйшых класаў сярэдняй школы.

Група студэнтаў-выпускнікоў гомельскага педінстытута: ГАЙМАНАЎ, ЖУКАЎ, ГЕРАСІМОВІЧ, ІЛЬЯНКОВА, СІДАРЭНКА, ТАМАРКІНА, КАРАЛЁВА, ПАЎЛАВА, ГОФМАН, СУВОРАЎ, ХАЙКІНА.

ПРАЦА ДЛЯ МЯНЕ—РАДАСЦЬ І ГОНАР

Прачытаў я праект новай Канстытуцыі. Кожны пункт яе гаворыць аб нашай вялікай магутнасці, у кожным радку адчуваюцца клопаты аб нас нашага роднага настаўніка і правадыра таварыша **Сталіна**.

Мімаволі мне ўспамінаецца: раней пры царскай уладзе мой бацька—яўрэй—вымушан быў хрысціцца, каб мець права на жыхарства не ў чарце яўрэйскай аседласці. Добра памятаю, як жыў бацька. У сям'і было 6 чалавек, жылі і працавалі ў маленькай хатцы. Бацька быў столярам. Бывала заробіць у памешчыка, у папа пуд хлеба, 5 вёрст нясе яго на сабе. Пра мяса, масла, белы хлеб не прыходзіцца і гаварыць. Чорнага хлеба і бульбы ўдосталь не было.

Звернемся да праекта новай Канстытуцыі. Тут указваецца ясна, што хто працуе, той і есць, незалежна ад таго, якой-бы ён ні быў нацыянальнасці.

Калгаснікі нашы жывуць заможна. Кожны мае карову, свіней, дробную жывёлу.

Вазьму сябе. Да ўступлення ў калгас я нічога не меў. Цяпер я маю карову, цёлку, 9 свіней, 20 гусей і інш. Мая сям'я з 7 чалавек забяспечана так, як я ніколі не марыў. У мяне ёсць удосталь сала, масла, белага хлеба, я адной толькі пшаніцы спытляваў 27 пудоў.

У 1935 годзе сам я выпрацаваў 700 працадзён. У дадатак да гэтага я працаваў над падарункам для палаца піонераў БССР.

За сваю адданую працу я быў многа раз прэміраван. Магілеўскі райвыканком узнагарадзіў мяне 5.000 рублямі для пабудовы новага дома.

Праца для мяне стала радасцю і гонарам.

Працую я ўжо каля 40 год. Пры царскай уладзе ў маіх гадах самы кваліфікаваны рабочы баяўся за заўтрашні дзень, каб яму не пайсці на вуліцу і пачаць жабраваць. Мы-ж, будучыя старыкі совецкай краіны, ведаем, што наша старасць будзе ў пашане. У сталінскай Канстытуцыі запісан спецыяльны пункт аб забеспячэнні старыкоў.

І я яшчэ больш буду працаваць над тым, каб даць рабочым і калгаснікам такую мэблю, якая адпавядала-б заможнаму, культурнаму і раднаму жыццю.

Я. С. АРЛОЎ,

столяр-калгаснік калгаса «Чырвонаармеец», Амхоўскага сельсовета (Магілеўскі раён).

Б. І. ПОСТНІКАУ

Намеснік старшыні Дзяржплана Калмыцкай АССР.

АДРОДЖАНЫ НАРОД

(Совецкая Калмыкія)

Амаль на працягу трохсот год царскі ўрад разам з калмыцкай феадальнай знаццю — наёнамі, (князямі), зайсангамі (дваранамі) і калмыцкім духавенствам прыгняталі і жорстка эксплаатавалі калмыцкі працоўны народ, давёўшы яго да грані поўнага эканамічнага жабрацтва, культурнай адсталасці і фізічнага выраджэння.

Толькі вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя і актыўная дапамога рускага пралетарыята далі магчымасць працоўным Калмыкіі скінуць з сябе векавы гнёт і стварылі ўмовы для хуткага гаспадарчага і культурнага росту Калмыцкай АССР. Увесь шлях, пройдзены за 15 год існавання яе аўтаноміі, з'яўляецца яркім доказам трыумфу і правільнасці ленінска - сталінскай нацыянальнай палітыкі.

У адміністрацыйных адносінах Калмыцкая рэспубліка падзяляецца на 7 улусаў (раёнаў). Колькасць насельніцтва на 1 студзеня 1936 года складала 179,6 тыс. чалавек, у тым ліку 70 проц. калмыкоў. Гарадскіх населеных пунктаў — 2. горад Эліста — рэспубліканскі цэнтр і рабочы пасёлак Канукоўск.

Раней амаль цалкам вандроўнае насельніцтва, цяпер у сувязі з завяршэннем калектывізацыі, ростам матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных і, дзякуючы ўсямернай дапамозе партыі і ўрада, хуткімі тэмпамі пераходзіць на аседлае жыццё. Калі па даных абследвання 1909 года лік вандроўных гаспадарак складаў 86 проц., то зараз іх колькасць не перавышае 10 проц.

Жывёлагадоўля — галоўнае багацце Калмыцкай АССР і асноўны занятак яе насельніцтва — прадстаўлена буйнай рагатай жывёлай мясарабочага напрамку, тонкарунным, поўгрубаваўнянай і грубаваўнянай, курдзючнай аўцагадоўляй і калмыцкім верхавым канём. Другараднае значэнне мае вярблюдагадоўля і свінагадоўля.

Дарэволюцыйная жывёлагадоўля насіла ярка выражаны экстэнсіўны, драпежніцкі характар.

Прыгон (афіцыяльна адменены царскім урадам толькі ў 1892 годзе) і напісаныя законы феадальнага быту давалі магчымасць нязначнай групе радавітай знаці, кулацтву і духавенству, якія ўладалі лепшымі выпасамі і вадапоямі, жорстка эксплаатаваць калмыцкую беднату, тым самым накапляючы велізарныя каштоўнасці ў форме безлічных стад рознай жывёлы. Так, у 1909 годзе толькі 6 проц. агульнай колькасці гаспадарак былога калмыцкага стэпу ўладалі 58 проц. усяго пагалоўя жывёлы, у той час, як 94 проц. насельніцтва былі асуджаны на поўгалоднае існаванне.

Мерапрыемствы комуністычнай партыі і совецкага ўрада, накіраваныя на справу развіцця жывёлагадоўлі, забяспечылі соцыялістычную рэканструкцыю яе і далейшы колькасны і якасны рост. Агульнае пагалоўе жывёлы на 1 студзеня 1936 года складае 153,4 проц. у адносінах да 1932 года і 120.9 проц. у адносінах да мінулага года.

Рашаючая роля ў аднаўленні і развіцці жывёлагадоўлі належыць соўгасам і калгасам, якія сканцэнтравалі ў сваіх руках усё асноўнае стада жывёлы. Агульная колькасць жывёлагадоўчых соўгасаў на 1 студзеня 1936 года складала 16. Арганізавана 347 калгасных таварных ферм. Калектывізацыя калмыцкага хатона (вёскі) складае 86 проц. Дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі ў 1935 годзе соўгасамі і калгасамі рэспублікі выканан па ўсіх паказальніках. Арганізавана рэспубліканская занальная жывёлагадоўчая станцыя з 4 апорнымі пунктамі, дзяржаўны племянны рассаднік, створаны 13 племянных калгасна-таварных ферм.

Семнаццаць перадавікоў соцыялістычнай жывёлагадоўлі рэспублікі — лепшыя чабаны, гуртаправы, даяркі ўзнагароджаны ордэнамі.

Стэп абвадняецца. За тры гады на ірыгацыйнае (абваднянальнае) будаўніцтва на мясцовым стоку затрачана 2.935,5 тыс. рублёў, у рэзультаце чаго рэспубліка атрымала 5.700 га правільнага і лімачнага абваднення.

Хутка і няўхільна развіваецца паляводства. У 1909 годзе па Калмыкіі засявалася ўсяго толькі 47,6 тысяч гектараў, прычым больш паловы ўсіх пасеваў (53,4 проц.) прыпадала на долю кулакоў. Зараз пасеўная плошча павялічылася да 167,000 га. Земляробства, якое раней ахапляла пераважна толькі паляводчы раён (Заходні улус), стала шырока развівацца і ў жывёлагадоўчых улусах. У Даўбанскім улусе ёсць вялікія перспектывы для развіцця паліўнога бавоўнаводства. Зараз бавоўнай там засеяна 1.200 га.

Расце агратэхніка і механізацыя сельскай гаспадаркі. Арганізаваны тры МТС, трактарны парк узрос да 140 адзінак. Калмыкія налічвае ўжо многа калмыцкіх юнакоў і дзяўчат — трактарыстаў і камбайнераў — ударнікаў і энтузіястаў барацьбы за агратэхніку, за высокі ўраджай.

Трэцяе месца ў эканоміцы рэспублікі займае рыбалоўства.

На долю калмыка-лаўца, невадняга і прамысловага рабочага, да рэволюцыі прыпадалі вечная кабала, бесчалавечная эксплаатацыя з боку буйных і дробных рускіх рыбапрамыслоўцаў, у руках якіх амаль да 1921 года знаходзіліся рыбныя промыслы, якія размяшчаны на тэрыторыі Калмыцкай рэспублікі.

Калмдзяржрыбтрэст, арганізаваны ў 1921 годзе, у пачатку сваёй дзейнасці меў усяго толькі 4 поўразбураныя рыбныя промыслы і некалькі суднаў пераважна па руснага флота. Карэнная перабудова арганізацыйных метадаў і тэхнікі здабываючага промысла і рэканструкцыя рыбнай прамысловасці зусім змянілі твар рыбнай гаспадаркі Калмыкіі.

Лавецкія гаспадаркі рэспублікі калектывізаваны на 99 проц. У цэнтры лавецкага насельніцтва ў пасёлку Лагані арганізавана машынарыбалоўная станцыя. Цяжкая праца невадных рабочых механізуецца. Машнее вытворчая магутнасць лавецкіх калгасаў, з году ў год больш заможным і вясёлым робіцца жыццё лаўца-калгасніка.

Рэканструюецца апрацоўваючы промысел. Апрача буйнейшага, абсталяванага паводле апошняга слова тэхнікі лаганскага кансервавага камбіната, трэст мае адзін плывучы кансервовы завод, магутнасцю ў 3 млн. умоўных банак, 5 буйных стацыянарных і 4 плавучых рыбазаводы.

Мясцовую прамысловасць Калмыкіі складаюць 3 цагельныя заводы, элісцінская і 7 улусных друкарань і 3 паравыя млыны. У 1936 годзе ў рэспубліканскім цэнтры будуецца швейная фабрыка, новы цагельны завод, вапнякoвы і алебастравы заводы і т. д. У бліжэйшыя два-тры гады будзе прыступлена да будаўніцтва прадпрыемстваў па перапрацоўцы жывёлагадоўчай прадукцыі (суконны камбінат, скурзавод і аўчынна-шубная фабрыка).

Адначасова з ростам гаспадаркі рэзка мяняецца і культурны твар рэспублікі. Растуць і мацнеюць нацыянальныя кадры. Хуткімі тэмпамі ствараецца нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу культура Совецкай Калмыкіі.

Яшчэ нядаўна, усяго 19 год таму назад, насельніцтва так званага Калмыцкага стэпу было амаль цалкам непісьменнае, асабліва калмыцкая жанчына. У 1913 годзе на кожныя 100 чалавек жыхароў прыходзілася ўсяго толькі 2—3 пісьменных. На ўсёй велізарнай тэрыторыі было толькі 30 школ, у якіх навучаліся 629 вучняў. Большасць гэтых школ была ў руках рускага духавенства, ярага праваднікa русіфікатарскай палітыкі царскага ўрада. Са школ выганялася родная мова калмыкоў.

У сучасны момант у рэспубліцы ёсць 191 пачатковая школа, 28 няпоўных сярэдніх і 4 сярэдніх школы, педагагічны, сельскагаспадарчы, ветэрынарны і драматычны тэхнікумы, педрабфак і партыйная сельскагаспадарчая школа. У пачатковай, няпоўнай сярэдняй і сярэдняй школе на 1 студзеня 1936 года было 29,6 тысяч вучняў. Сотні калмыцкай моладзі вучацца ў вышэйшых навучальных установах іншых гарадоў Саюза. Пісьменнасць у цэлым па рэспубліцы складае 86 проц.

Зараз няма такога кутка ў Калмыкіі, куды-б не пранікала кніга і газета. У Калмыцкай АССР выдаюцца 25 газет, у тым ліку 4 рэспубліканскія. Калмыцкае выдавецтва выпускае ў 1936 годзе 93 назвы мастацкай, палітычнай і папулярнай навукова-тэхнічнай літаратуры агульным тыражом 430,5 тысяч экземпляраў.

Калмыцкія працоўныя масы высунулі са свайго асяроддзя маладых таленавітых пісьменнікаў і паэтаў. У бліжэйшы час пачне працаваць нацыянальная драматычная трупа, якая складаецца з маладых артыстаў калмыкоў — выхаванцаў драматычнага тэхнікума.

Навуковай медыцыны да Кастрычніцкай рэволюцыі ў Калмыкіі амаль не існавала. «Лячэннем» займалася пераважна будыйскае духавенства, якое калечыла людзей. Беспрасветная галеча, поўгалоднае існаванне, нечалавечыя бытавыя ўмовы — усё гэта стварала спрыяючую глебу для шырокага распаўсюджання соцыяльных хвароб (сухоты, трахома, венерычныя хваробы) і вяло да вымірання працоўных калмыкоў.

Соцыялістычная рэволюцыя стварыла калмыцкаму працоўнаму народу радасныя, культурныя ўмовы жыцця і гэтым самым забяспечыла яму хуткае фізічнае адраджэнне. Калмыкія пакрылася цэлай сеткай лекавых і прафілактычных устаноў. Калі ў 1913 годзе ў Калмыцкім стэпу было толькі 5 бальніц з 77 ложкамі, то ў 1936 годзе бальнічная сетка Калмыкіі складае 75 адзінак і мае 511 ложкаў. Арганізаваны 4 вендыспансеры і 1 сухотны дыспансер. Створан спецыяльны Яшкульскі прафілактычны гарадок па барацьбе з сіфілісам. Ва ўсіх улусах існуе па некалькі пунктаў па барацьбе з трахомай.

Калмыкія налічвае 44 радзільныя дамы і акушэрскія пункты, 37 дзіцячых ясляў і садоў. Зараз у рэспубліцы працуе 51 урач і 230 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу. У Элісце будуецца медыцынскі тэхнікум.

Адным з выдатных дасягненняў працоўных Совецкай Калмыкіі з'яўляецца будаўніцтва рэспубліканскага цэнтра — горада Элісты. Прайшло толькі 8 гадоў з пачатку будаўніцтва і калісьці зусім голы стэп пакрыўся дзесяткамі новых будынкаў. Пабудаваны Дом урада, сярэдняя школа, педтэхнікум, ветэхнікум, бальніца і многа жылых і іншых будынкаў. Праведзен водаправод, заканчваецца пабудова новай электрастанцыі замест часовай. Разбіты паркі і скверы.

Рост культуры і карэнная перабудова вытворчых адносін унеслі ломку старога быту і ўкладу жыцця. Калмыцкая жанчына — учарайшая забітая нявольніца свайго мужа — сёння выйшла на шырокі творчы шлях і рука аб руку з мужчынай прымае актыўны ўдзел у будаўніцтве соцыялізма. Замест ачага закапцелай, бруднай кібіткі, мы зараз сустракаем калмыцкую жанчыну за рулём аўтамашыны, трактара, лаўцом на моры работніцай прамысловых прадпрыемстваў, артысткай, настаўніцай, урачом, лётчыцай і т. д.

Уся Калмыкія ведае імя Нормы Шапшуковай, актыўнага байца гераічнай Першай коннай, героя грамадзянскай вайны, якая за баявыя заслугі ўзнагароджана саюзным урадам ордэнам «Красной звезды».

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна —Сталіна, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народу Совецкая Калмыкія дабілася вялікіх перамог і поспехаў на гаспадарчым і культурным фронце. Ператварэнне Калмыкіі ў Кастрычніку 1935 года з вобласці ў аўтаномную Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку з'яўляецца новай гістарычнай вехай у развіцці Совецкай Калмыкіі і адкрывае перад ёю новыя найшырэйшыя перспектывы далейшага шпаркага росту соцыялістычнай гаспадаркі і культуры.



Артыкул тав. Постнікава аб Совецкай Калмыкіі — чарговы з серыі артыкулаў аб краях, аўтаномных рэспубліках і абласцях. У ранейшых нумарах «Звязды» былі змешчаны артыкулы аб Совецкай Карэліі (18 мая), Паўночным Каўказе (24 мая), Совецкай Малдавіі (30 мая), Данецкай вобласці (6 чэрвеня), Абхазскай АССР (12 чэрвеня) і Татарскай АССР (24 чэрвеня).

Сёння ў Менску заканчваюць вучобу курсанты-камбайнеры



НА ЗДЫМКУ (злева направа): тав. МАЦЭПУРА М. Е. — дырэктар курсаў камбайнераў і выпускнікі курсаў—выдатнікі вучобы тт. ГАПАНОВІЧ П. Н., МІКУС Л. І., САМЧУК І. К., МЯЦЕЛЬСКІ М. Ф., КУБКОЎСКІ І. С., ПАШЧЭНЯ І. і ЯКАЎЦОЎ В. К.

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ НОВАМУ АТРАДУ ВАДЗІЦЕЛЯУ СОВЕЦКІХ КАМБАЙНАУ

НАВЕЧНА ПАКОНЧАНА З ЗЯМЕЛЬНАЙ ЦЕСНАТОЙ

Я яшчэ зусім малады, мне 24 гады. Жыццё маё склалася так, як складваецца яно зараз для ўсёй моладзі нашай вялікай радзімы: жыццё шчаслівае і радаснае.

У 1930 годзе я ўступіў у калгас. Праз некаторы час як калгасніка-ўдарніка мяне накіравалі на курсы трактарыстаў. Працаваў я на трактары нядрэнна, перавыконваў нормы, даваў добрую якасць працы.

А цяпер я скончыў на «выдатна» курсы камбайнераў. Быць камбайнерам — гэта вялікі гонар для кожнага з нас! Я абавязуюся апраўдаць ганаровае званне камбайнера, буду змагацца за ўборку 500 гектараў на сваім камбайне.

Я ўжо некалькі разоў чытаў праект новай сталінскай Канстытуцыі. Гэты велізарнейшы дакумент нашай эпохі надае яшчэ больш энергіі ў рабоце, бо ў кожным пункце Канстытуцыі мы адчуваем вялікія перамогі соцыялізма ў нашай краіне, адчуваем нашу сілу, клопаты нашага любімага Сталіна аб усіх нас, працоўных, аб далейшым росце нашай заможнасці, нашай культуры. Сталінская Канстытуцыя замацоўвае за калгасамі шырокія калгасныя масівы зямлі навечна. На гэтых масівах я буду камбайнам убіраць высокі ўраджай.

У сувязі з гэтым я ўспамінаю лёс майго бацькі. Іх было тры браты, а зямлі толькі дзве з паловаю дзесяціны, немагчыма было жыць, зямля мачыхай была. Кідаліся ва ўсе бакі шукаць кавалку хлеба. З-за зямельнай цеснаты бацька кінуў усё і паехаў у Амерыку. Было гэта да імперыялістычнай вайны, у 1913 годзе. Бацька мусіць, думаў у Амерыцы шчасця знайсці, але там не знайшоў яго. Ён піша нам пісьмы, у якіх расказвае ўсю жудаснасць становішча рабочых у капіталістычнай Амерыцы.

Цяпер бацька беспрацоўны, яму ўдаецца працаваць толькі адзін раз у тыдзень. І хаця буржуазныя газеты ўвесь час хлусілі і наводзілі паклёпы на Совецкі Саюз, але вялікая праўда аб нашай шчаслівай радзіме даходзіць да рабочых і ўсіх працоўных капіталістычнага свету.

Вось што піша мне бацька.

«Сын мой родны! Я вельмі задаволены, што ты трактарыстам працуеш у калгасе, што жыццё ў вашай краіне такое радаснае, шчаслівае... Доўгі час капіталістычныя пісакі падносілі нам розныя паклёпы на Совецкі Саюз. Яны пісалі, што ў вас голад, што людаедствам займаюцца... А ці ведаеш, сынок, чаму яны так пісалі? А таму, што яны адчуваюць свой крах, таму, што ў іх мільёны беспрацоўных, і яны, капіталісты, думаюць запалохаць рабочых. Вунь, глядзі, гадзюкі-фашысты бягуць з Іспаніі, бо яны бачаць гнеў пролетарыята і блізасць расправы... Яркім полымем гарыць над светам нявольніцтва і пакутаў новая зара.

Шлю найлепшыя пажаданні і маё сардэчнае прывітанне ўсяму вашаму калгасу. Няхай жыве Совецкі Саюз!».

Значыць, зямельная цесната, ад якой калісьці ўцякаў мой бацька, знайшла яго і за акіянам. Бацька цяпер гэта вельмі добра разумее. У нас-жа яе няма; навек знішчана зямельная цесната! Там, дзе раней было цесна, цяпер расцілаюцца шырокія масівы соцыялістычных палёў, няма меж і разор, нашы трактары і камбайны апрацоўваюць і ўбіраюць багаты сталінскі ўраджай. І я шчаслівы, што адна з гэтых машын даверана мне.

Гэтае давер'е партыі і ўраду я ўсімі сіламі пастараюся апраўдаць.

П. Н. ГАПАНОВІЧ.

БУДУ ПРАЦАВАЦЬ ЯК ПАША АНГЕЛІНА

Бацька мой быў рабочым шклозавода. Але я яго не памятаю, памёр ён маладым, была я тады зусім малая. Не паспела я падрасці, як яшчэ адзін удар: памёрла матка. Засталася я сіратою.

Што сталася-б са мной беспрытульнай, круглай сіратой, дачкою рабочага ў стары час?.. Кожны кулак мог-бы з мяне здзекавацца беспакарана, не было-б каму заступіцца.

Але ўжо існавала тады совецкая ўлада, значыць было ўжо каму аба мне паклапаціцца. Мяне прынялі ў дзіцячы дом, дзе я прабыла амаль 14 гадоў. Тут мяне выхавалі, тут я расла і вырасла разам з нашай соцыялістычнай радзімай. Я яшчэ і цяпер з вялікім хваляваннем і ўдзячнасцю ўспамінаю дзіцячы дом.

У 1930 годзе я пайшла з дзіцячага дома і паступіла працаваць у швейную майстэрню. Да таго часу ў вёсцы ўжо з'явіліся першыя трактары. І пацягнула мяне да трактара: начамі не спала, усё марыла стаць трактарысткай!

У 1934 годзе мае мары ажыццявіліся. У Копылі арганізаваліся курсы трактарыстаў. Я яшчэ добра памятаю, як многія мяне ўгаварвалі не паступаць на курсы, пераконвалі што працаваць на трактары могуць толькі мужчыны. Але я ўсё-ж такі паступіла і паспяхова скончыла курсы трактарыстаў.

Пасля курсаў працавала трактарысткай у брыгадзе знатнай трактарысткі **Зоні Рачок.**

З вялікай радасцю я 5 месяцаў таму назад паступіла на курсы камбайнераў. Я добра ведала, што аўладаць такой складанай машынай, як камбайн, зусім не лёгка. А таму я вучылася ўпарта. Цяжка мне перадаць сваю радасць з повàду таго, што я скончыла курсы на «выдатна». Я не магу дачакацца таго дня, калі мне прыдзецца выехаць з камбайнам на шырокія калгасныя палі.

Дзякую нашай партыі, роднаму бацьку **Сталіну** за радаснае жыццё. Я пастараюся працаваць як Марыя Дземчанка, як Паша Ангеліна, каб быць вартай тых клопатаў, якія аб нас праяўляе родны **Сталін.**

ЛЮБА МІКУС.

ГАЛОЎНАЕ— ПАДРЫХТАВАЦЬ ЛЮДЗЕЙ

У Менск на курсы камбайнераў я прыехаў з Грэскай МТС, дзе працаваў трактарыстам. На курсах я ўпершыню ўбачыў камбайн. Прызнацца, адразу я неяк перапалохаўся: ці здолею асвоіць такую складаную машыну. Але я паставіў перад сабой задачу — абавязкова стаць камбайнерам, прычым добрым камбайнерам. Рашыў вывучыць камбайн на «выдатна». Да гэтага абавязвала мяне і тое, што я — кандыдат КП(б)Б.

Ішлі дні і тыдні. Я вучыўся ўпарта, з кожным днём адчуваў прыліў бадзёрасці, бо пачаў асвойваць камбайн. Тады я рашыў змагацца за адзнаку «выдатна» па ўсіх дысцыплінах. І я гэтага дабіўся!

Былі ў нас і слабейшыя таварышы, якія прышлі са слабай падрыхтоўкай. Вучоба ім адразу давалася досыць цяжка. Я рашыў дапамагчы ім. Узяў шэфства над курсантамі Зайцам Сямёнам і Кароль Юзефай і дабіўся таго, што гэтыя таварышы здалі асноўныя дысцыпліны на «добра», а некаторыя дысцыпліны нават і на «выдатна».

Хутка прайшоў час нашай вучобы. Цяпер ужо трэба прыступіць да практычнай работы. Зразумела, вельмі многа залежыць ад таго, як кожны з нас асвоіў камбайн, як мы ведаем усе яго часткі, усе яго дэталі. Але скажу я, што гэта не ўсё. Яшчэ вельмі многа залежыць ад таго, як будуць падабраны людзі, якія абслугоўваюць камбайн. Гэта мы добра ведаем з работы на трактары. Трэба правільна падабраць людзей, падрыхтаваць іх добра, правільна арганізаваць адвозку і сушку зярна. Няправільна думаць, што гэтымі пытаннямі павінна займацца толькі кіраўніцтва калгаса. Кожны з нас з'яўляецца начальнікам агрэгата. І калі мы хочам дабіцца перамогі, трэба сёння-ж падабраць людзей, каб кожны ведаў, што ён будзе рабіць.

Я паставіў перад сабой задачу: убраць у гэтым годзе на паўднёвым камбайне «Комунар» 500 гектараў. Задача — нялёгкая, але я яе выканаю. Разам з гэтым я рашыў з лепшых трактарыстаў падрыхтаваць камбайнераў.

За гэта я буду змагацца сур'ёзна, не шкадуючы сіл і часу. Справа гонару для нас, маладых камбайнераў, дабіцца высокіх паказальнікаў работы, з тым, каб ордэнаносная Беларусь была ў радах перадавых рэспублік і абласцей Совецкага Саюза і па тэмпах і па якасці ўборачных работ, каб не дапусціць страт ураджаю, каб своечасова выканаць абавязацельствы перад дзяржавай па хлебапастаўках.

М. Ф. МЯЦЕЛЬСКІ.

ДОБРА ПАДРЫХТАВАЦЬ УЧАСТАК ДЛЯ РАБОТЫ КАМБАЙНЕРАЎ

Я часта ўспамінаю той момант, калі ўпершыню ў нашым калгасе «Гігант», Капыльскага раёна, з'явіўся трактар. І стары і малы — усе на вуліцу высыпалі. Некалькі дзён засаб толькі аб трактары і было размоў у вёсцы. Я тады цвёрда рашыў стаць трактарыстам. І гэтага я дабіўся.

Яшчэ з большым уздымам я ўзяўся за вывучэнне камбайна. Стаць камбайнерам — аб гэтым я марыў даўно, але асабліва мяне пацягнула да камбайна пасля гістарычнай прамовы таварыша **Сталіна** на Ўсесаюзнай нарадзе камбайнераў і камбайнерак, бо я ўбачыў, якое вялікае значэнне наш любімы правадыр надае камбайнам, як высока ён цэніць камбайнераў.

Быў я трактарыстам; таксама адказная работа. А вось з пісьменнасцю ў мяне было слабавата. Прыехаўшы на курсы камбайнераў, я гэта адчуў з першых-жа дзён. Апрача камбайна нам пачалі выкладаць тэхнічную механіку, матэматыку, чарчэнне, грамадскія дысцыпліны. А што я ведаў у камбайне? Зусім нічога. А камбайн. ён такі, што пачнеш, не ведаючы яго, разбіраць па костачках, дык галава закружыцца. А ведаць трэба добра: і пабудову малатарнага апарата, і ражучага, і ўзаемаадносіны ўсіх частак. Ды што і казаць: кожны шрубік трэба ведаць, як сваіх пяць пальцаў, а інакш, які з цябе камбайнер?..

Адным словам, вучоба наша была вельмі складанай. Я-ж нават не ведаў чатырох дзеянняў арыфметыкі, а тут табе дробы простыя і дзесятковыя, прапорцыі. Такое-ж становішча з геаметрыяй, аб якой я проста не меў уяўлення.

І ўсё-такі я здаў усе дысцыпліны на «выдатна». І не толькі я адзін, а большасць нашых студэнтаў. Гэтага мы дасягнулі выключна ўпартай работай.

Вельмі многа нам дапамаглі выкладчыкі — тт. **Снібо, Бірыч, Мазурка,** начальнік нашых курсаў тав. **Мацэпура** і другія. Яны былі і нашымі выкладчыкамі і чулымі таварышамі. Прыходзілі ў інтэрнат у пазашкольны час, цікавіліся што нам не зразумела, дапамагалі нам.

Я так звыкся з курсамі, што цяпер нават цяжка развітвацца. Можа гэта таму, што асабліва за апошнія месяцы мы адчулі смак у вучобе, сталі адчуваць свой рост.

Скончыўшы вучобу, я еду ў МТС з упартым жаданнем паказаць узоры большэвіцкай работы на камбайне. Час, які застаўся да пачатку ўборкі, я думаю выкарыстаць поўнасцю, усур'ёз прадумаць план сваёй работы. Асабліва важна цяпер дасканала ўстанавіць участкі, дзе буду працаваць, каб плошчы былі роўныя, не засмечаныя. Працаваць усляпую — значыць праваліцца. Таксама трэба ўважліва падбіраць і людзей, якія будуць абслугоўваць камбайн, каб ужо загадзя ведаць, дзе хто будзе працаваць.

Нашы курсы працавалі толькі 5 месяцаў, але мы атрымалі адносна многа ведаў, таму, што аб паспяховасці нашай вучобы клапаціўся ЦК КП(б)Б і асабіста тав. **Гікало,** кіраўнік большэвікоў Беларусі.

Ад шчырага сэрца дзякую нашаму любімаму таварышу **Сталіну** за клопаты аб нас, дзякую за шчаслівае жыццё, якое заваёвана пад яго мудрым кіраўніцтвам. Узорамі стаханаўскай работы пастараюся апраўдаць высокае, ганаровае званне камбайнера.

І. ПАШЧЭНЯ.



Група курсантаў-камбайнераў менскіх курсаў вывучаюць паўночны камбайн.
Фото Іванова.

МАЦЭПУРА
Начальнік курсаў камбайнераў

ПЕРШЫ АТРАД БЕЛАРУСКІХ КАМБАЙНЕРАЎ

Сёння заканчваюць пяцімесячную вучобу першыя курсы камбайнераў пры Беларускай станцыі механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. 104 чалавекі атрымліваюць званне камбайнераў. Па прадмету «камбайны» 90 чалавек здалі экзамен на «выдатна» і 14 чалавек на «добра». Па ўсіх прадметах (камбайны, трактарная справа, тэхнічная механіка, арыфметыка, палітыка і інш.) на «выдатна» здалі экзамены 50 чалавек.

Гэтыя выдатныя вынікі вучобы курсаў атрыманы дзякуючы штодзенным клопатам і дапамозе курсам з боку ЦК КП(б)Б і асабіста таварыша **Н. Ф. Гікало.** Гэтыя клопаты і дапамогу адчувалі не толькі мы, кіруючы склад курсаў, але і ўвесь калектыў курсантаў. Адказаўшы на клопаты партыі дысцыплінаванасцю і ўпартай вучобай. Прадстаўнікі кожнай МТС спаборнічалі на выдатнае сканчэнне курсаў. Больш моцныя курсанты дапамагалі адстаючым.

Уся тэхнічная база—камбайны, трактары, майстэрня—былі прадастаўлены курсам. Курсы мелі пяць камбайнаў і столькі-ж трактараў,— гэта дало магчымасць кожнаму курсанту разабраць і сабраць камбайн па два разы, а што датычыцца зборкі і рэгуліроўкі асобных вузлоў камбайнаў, то кожнаму курсанту прыходзілася гэта рабіць некалькі разоў. Усе курсанты праводзілі і рамонт камбайнаў, у асаблівасці паўночнага камбайна. Пазакласныя заняткі курсантаў у большасці праходзілі каля камбайнаў. Гэтаму спрыялі, галоўным чынам, тыя абставіны, што інтэрнат курсаў знаходзіўся на тэрыторыі станцыі, дзе была сканцэнтравана ўся вучэбная і тэхнічная база курсаў.

У пачатку курсаў мы мелі разнастайны склад вучняў. На курсы прыехалі трактарысты з вялікім і малым стажам, машыністы малатарань, а таксама некалькі чалавек, не маючыя ні той ні другой спецыяльнасці.

Па агульнаадукацыйнаму ўзроўню была яшчэ больш пярэстая карціна. У большасці сваёй гэта — скончыўшыя 3 і 4 класы. Былі і такія, якія мелі адукацыю толькі за 2 групы, або за лікпункт. Побач з імі было некалькі чалавек, скончыўшых 5—6 і нават 7 класаў.

Па ўзроснаму складу большасць камбайнераў — ад дваццаці і да сарака год. Маладзей 20 год — толькі тры курсанты, каля дзесятка чалавек — старэй 40 год.

Перад намі стаяла задача: зрабіць кожнага малапісьменнага курсанта не толькі пісьменным, але і выдатнікам-камбайнерам. У кожнага з іх было велізарнае жаданне аўладаць граматай, аўладаць складанай машынай — камбайнам.

Як прыклад можна ўзяць курсанта **Зайца Сямёна Іванавіча** — трактарыста з Глускай МТС. Ён быў малапісьменным. Спачатку цяжка было яму вучыцца, ды і настаўнікам было не менш цяжка працаваць з малапісьменнымі. І не раз можна было пачуць ад тав. Зайца адказ настаўніку: «Мая тэорыя на полі». Аднак, пасля ўпартай работы над тав. Зайцам, апошні не толькі здаў камбайны і трактарную справу на «выдатна», але і такія прадметы, як тэхнічная механіка і арыфметыка на «добра».

Большэвіцкая арганізаванасць і барацьба за ганаровае званне камбайнера перамаглі ўсе цяжкасці, і пяць месяцаў упартай вучобы зрабілі ўсіх курсантаў камбайнерамі і, у большасці сваёй, камбайнерамі-выдатнікамі. На цэлую галаву людзі выраслі тэхнічна: атрымалі новую высокую і ганаровую кваліфікацыю совецкага камбайнера. І не толькі тэхнічна выраслі людзі, яны выраслі і палітычна і культурна. Партыйная арганізацыя станцыі і курсаў, пад кіраўніцтвам Варашылаўскага райкома партыі, праводзіла сярод курсантаў вялікую палітычную і выхаваўчую работу. Выпускаемыя камбайнеры — гэта і грамадчыкі, гэта і актыўныя работнікі вёскі.

Аднак, выдатны вынік вучобы — гэта толькі першая заваёва камбайнераў. Другая частка работы, якая дасць канчатковае меркаванне аб якасці кожнага камбайнера, гэта— практычная работа на камбайне ў гэтым годзе.

Спаборніцтва сярод камбайнераў за ўборку кожным камбайнам у МТС і соўгасах Беларускай ССР не менш 300 гектараў — упаўне рэальнае абавязацельства, але каб выканаць яго, кожны камбайнер павінен запомніць, што поспех яго работы будзе залежаць перш за ўсё ад арганізацыі работы. Падрыхтоўка ўчасткаў, машыны, арганізацыя работы людзей свайго агрэгата, любоўныя адносіны да людзей і машыны — гэта першая ўмова поспеху работы камбайнера. У гэтым камбайнеру павінны дапамагчы ў першую галаву дырэктар МТС або соўгаса.

Не зазнавацца і не супакойвацца на дасягнутых поспехах у вучобе! Зазнайства і супакоенне, што, моў, «ведаю камбайн на «выдатна», значыць усё ў парадку», вельмі шкодная рэч. Не трацячы ніводнай мінуты, камбайнеры, прыехаўшы на месца, павінны па-большэвіцку ўзяцца за падрыхтоўку машын і арганізацыю работ. З дапамогай дырэктара і старэйшага механіка МТС, якія нясуць не меншую адказнасць за выкарыстанне камбайна, камбайнер павінен праверыць яшчэ і яшчэ раз машыну і людзей, з якімі яму прыдзецца працаваць, яшчэ раз і самога сябе, няспынна працаваць над далейшым узняццем свайго тэхнічнага і культурнага ўзроўню.

Кожнаму камбайнеру трэба ўлічыць, што камбайны ў БССР ў гэтым годзе завозяцца ўпершыню для масавага іх выкарыстання ў калгасах і соўгасах і што яны — першыя камбайнеры ў БССР, якім партыя і ўрад давярае ганаровую задачу — уборку высокага ўраджаю камбайнамі, і што ад камбайнера, галоўным чынам, будзе залежаць поспех справы.

Ні на адну мінуту нельга забываць, што класавы вораг дзе-ні-дзе паспрабуе дыскрэдытаваць работу камбайнаў, выкарыстоўваючы для гэтага ўсе магчымыя сродкі. Вось чаму якое-б та[illegible] ні было ратазейства, зазнайства і самасупакоенасць не павінны мець месца сярод нашых камбайнераў.

Няма сумнення, што камбайнеры, ўзброеныя дастатковымі тэарэтычнымі і практычнымі ведамі, апраўдаюць сябе на практычнай рабоце ў барацьбе за сталінскі ўраджай!

Аб ходзе работ па выдачы дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй калгасам

ПАСТАНОВА СНК БССР І ЦК КП(б)Б

СНК БССР і ЦК КП(б)Б, заслухаўшы паведамленне Камісіі Партыйнага Кантроля, адзначаюць зусім нездавальняючы ход выканання важнейшай пастановы партыі і ўрада — выдачы актаў калгасам на вечнае карыстанне зямлёй: на 1 чэрвеня г. г. выдана ўсяго 40 проц. актаў, што ставіць пад пагрозу прамога зрыву сканчэнне выдачы актаў у тэрмін — да 1 лістапада г. г. У радзе раёнаў (Чашніцкім, Халопеніцкім, Камарынскім, Сенненскім, Журавіцкім, Хойніцкім і інш.) работа па выдачы актаў, як гэта ўстаноўлена КПК, перадаверана землеўпарадчыкам; райкомы, райвыканкомы і райза самаўхіліліся ад гэтай работы. У выніку выдача актаў у гэтых раёнах не перавышае 5—10 проц. У другіх раёнах, як Талачынскі, Бешанковіцкі, Лёзнянскі, Лагойскі, Клічаўскі, акты ляжаць доўгі час гатовымі і не выдаюцца калгасам. Як правіла, амаль ва ўсіх раёнах з рук вон дрэнна пастаўлен учот выдачы актаў. Райвыканкомы і райза раду раёнаў (Горацкі, Халопеніцкі, Талачынскі і Уздзенскі) выпусцілі з рук кіраўніцтва землеўпарадчымі работамі, дапусцілі расхлябанасць і недысцыплінаванасць землеўпарадчага апарата і самі не выконваюць указання СНК і Наркамзема.

СНК і ЦК лічаць, што такое недапушчальна дрэннае становішча са справай выдачы калгасам актаў на вечнае карыстанне зямлёй па рэспубліцы і асабліва ў вышэйпаказаных раёнах з'явілася вынікам недаацэнкі з боку раду партыйных і совецкіх раённых арганізацый велізарнага палітычнага і гаспадарчага значэння данага мерапрыемства і няўмення ўвязаць яго з усімі праводзячыміся сельскагаспадарчымі работамі ў раёне.

СНК і ЦК КП(б)Б адзначаюць таксама зусім недастатковае апаратыўнае кіраўніцтва гэтай работай з боку Наркамзема, асабліва яго землеўпарадчага кіраўніцтва.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б **пастанаўляюць:**

1. Абавязаць акругкомы і райкомы КП(б)Б, акрвыканкомы і райвыканкомы і ўсе раённыя зямельныя органы на працягу бліжэйшай дэкады праверыць становішча падрыхтоўкі да выдачы актаў, устанавіўшы, як правіла, заслухоўванне кожныя паўтары-дзве дэкады на бюро АК і райвыканкома паведамленняў старшынь райвыканкомаў і загадчыкаў райза аб ходзе гэтай работы. Неабходна даць рашучы адпор усякім спробам супроцьпаставіць работу па выдачы актаў бягучым сельскагаспадарчым кампаніям і, наадварот, забяспечыўшы безагаворачнае сканчэнне работы па выдачы актаў калгасам да 1 лістапада г. г.

2. Прапанаваць НКЗ умацаваць землеўпарадчае кіраўніцтва і паставіць апаратыўнае кіраўніцтва справай выдачы актаў такім чынам, каб у далейшым не паўтараліся факты непрадстаўлення месяцамі справаздач з месц аб ходзе выдачы актаў і невыканання ўказанняў Наркамзема, у прыватнасці, неадкладна выявіць прычыны непрадстаўлення справаздачнасці і несвоечасовай выдачы зарплаты землеўпарадчыкам з боку райза і старшых землеўпарадчыкаў Клімавіцкага, Уздзенскага, Менскага і Лагойскага раёнаў і прыцягнуць вінаватых да стражэйшай адказнасці.

3. Абавязаць пад асабістую адказнасць старшынь райвыканкомаў Жлобінскага і Уздзенскага раёнаў адкамандзіраваць частку землеўпарадчыкаў сваіх раёнаў у іншыя раёны па ўказанню Наркамзема і ва ўстаноўленыя ім тэрміны.

СНК і ЦК КП(б)Б папярэджваюць райкомы, райвыканкомы і райза, што за невыкананне ўказанняў Наркамзема ў справе размеркавання землеўпарадчых кадраў, самавольнае затрыманне іх, скарыстанне на іншых работах не па прызначэнню — будзе разглядацца ў далейшым як просты зрыў работы па выдачы актаў і вінаватыя будуць прыцягвацца да стражэйшай партыйнай і судовай адказнасці.

4. Абавязаць акругкомы і райкомы, акрвыканкомы, райвыканкомы і райза выявіць і знішчыць усе прычыны, перашкаджаючыя правільнай арганізацыі землеўпарадчых работ, стварыць неабходныя культурна-бытавыя ўмовы для землеўпарадчыкаў па месцу іх работы ў калгасах і раёнах, разгарнуць сярод іх соцыялістычнае спаборніцтва, асвятляючы ў рэспубліканскай прэсе і раённых газетах паказ стаханаўскіх метадаў работы паасобных работнікаў і ўсяляк заахвочваючы добрую работу землеўпарадчыкаў.

5. Заслухаць на бліжэйшым пасяджэнні СНК даклады старшынь Камарынскага, Халопеніцкага, Сенненскага, Чашніцкага і Талачынскага райвыканкомаў аб прычынах дрэннай работы па выдачы актаў і затрыманні іх выдачы, сістэматычна правяраючы ў далейшым работу райвыканкомаў і Наркамзема па выдачы актаў.

6. Правесці шырокую растлумачальную работу ў калгасах, прыцягваючы іх да аказання землеўпарадчым партыям пры правядзенні імі работ па падрыхтоўцы да выдачы актаў усямернай дапамогі, у той-жа час бязлітасна выкрываючы і прасякаючы малейшыя спробы астаткаў класава-варожых элементаў затармазіць работу па своечасовай выдачы калгасам актаў на вечнае карыстанне зямлёй.

ЗРЫВАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА ЗЕРНАСУШЫЛАК І КРЫТЫХ ПАВЕЦЕЙ

СЯННО. Ніхто з раённых кіраўнікоў не адмаўляе вялікага значэння зернасушылак і крытых павецей і неабходнасці іх будаўніцтва. Наадварот, тут аб гэтым гавораць надзвычай многа, шмат пішуць розных адносін у калгасы.

Яшчэ 31 мая была вынесена пастанова РК КП(б)Б і РВК аб падрыхтоўцы да ўборкі, дзе было сказана і аб павецях і аб зернасушылках. 11 чэрвеня ўсім старшыням калгасаў была паслана дырэктыва, згодна якой кожны калгас да 20 чэрвеня павінен быў закончыць будаўніцтва зернасушылак.

Прайшло 20 чэрвеня, а большасць калгасаў раёна да будаўніцтва яшчэ не прыступіла. Калгасы «Прыветак», «Чырвоная гара», імя Сталіна і імя Кірава, Ульянаўскага сельсовета, да гэтага часу нават не загатовілі матэрыялаў для будаўніцтва. Старшыні гэтых калгасаў разважаюць так: «Яшчэ рана будаваць, хопіць часу!».

Праўленні калгасаў «Чырвоны шлях», «Буй», «Другая пяцігодка» і «Осішча», Латыгальскага сельсовета, цэглу для сушылак выкупілі, але не паклапаціліся перавезці яе ў калгасы. Аналагічнае становішча ў многіх калгасах Машчонскага і інш. сельсоветаў.

Райземаддзел зрывам будаўніцтва зернасушылак ніколькі не ўстрывожан. Даслаўшы ў калгасы планы будаўніцтва, загадчык райземаддзела т. **Падалякін** палічыў работу сваю закончанай. Калгасам не аказваецца ніякай тэхнічнай дапамогі, практычных указанняў ім не даецца і не ажыццяўляецца належнае кіраўніцтва.

Тэхнік-будаўнік райземаддзела некалькі тыдняў прабыў у калгасе «Ударнік», Раснянскага сельсовета, дзе кіраўнікі раёна меркавалі было будаваць паказальную зернасушылку, каб азнаёміць з тэхнікай будаўніцтва ўсе калгасы. Але з гэтага нічога не вышла. Пераважная большасць калгасаў і да сёнешняга дня не ведае, з чаго пачаць будаўніцтва.

АЛ. МАХНАЧ.

„НЯМА ВЕНТЫЛЯТАРАЎ— НЯМА І БУДАЎНІЦТВА“

ЛЮБАНЬ. Добрыя пасевы ў гэтым годзе на палях Любаншчыны. Адкрасавала жыта — пачаў налівацца буйны жытнёвы колас. Пачынае красаваць азімая пшаніца. Недалёка адказны перыяд работы—уборка. Як-жа рыхтуюцца да ўборкі ўраджаю ў раёне?

Дрэнна рыхтуюцца.

Рамонт уборачнага інвентара ў калгасах Яменскага сельсовета яшчэ не распачаты. А патрэбна адрамантаваць 5 жнярак, 3 сенакасілкі, 6 конных грабель. У калгасе «1 жніўня», гэтага сельсовета, ёсць дзве жняркі, якія патрабуюць рамонту, але іх не рамантуюць. Жняркі стаяць каля кузні пад адкрытым небам і іржавеюць. Старшыня калгаса **Шарко** разважае:

— Няма чаго спяшацца з рамонтам. Паспеем адрамантаваць.

У кожным калгасе сельсовета па плану патрэбна пабудаваць крытыя такі, а ў калгасе «1 жніўня» і «Чырвоны комунар» будаўніцтва зернасушылкі не распачата.

Не распачата будаўніцтва зернасушылак сістэмы інжынера Уварава і ў калгасах «Пролетарый» і «Прагрэс», Рачэнскага сельсовета.

Ні ў адным калгасе раёна не падрыхтаваны гумны і склады.

Раённы зямельны аддзел не кіруе і не дапамагае калгасам у будаўніцтве. Так, старшыня калгаса «Звязда», Рэдкаўскага сельсовета, **Рашчэня** некалькі раз хадзіў у райза, каб яму дапамаглі ў праектаванні зернасушылкі, але дапамогі так і не атрымаў...

Ганебнае зацягванне будаўніцтва зернасушылак кіраўнікі райза тлумачаць адсутнасцю вентылятараў, труб, сіт.

— Няма вентылятараў, труб і сіт — няма і будаўніцтва, — бездапаможна апраўдваецца тэхнік будаўніцтва **Сямененя.**

Адным словам, не рыхтуюць у Любані дастойнай сустрэчы новаму ўраджаю. Спакой і ціўшыня пануюць у раёне.

М. ДАСТАНКА.

СПРЭЧКІ АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ ВА ФРАНЦУЗСКІМ СЕНАЦЕ

ПАРЫЖ, 26 чэрвеня. (БЕЛТА). Знешнепалітычныя спрэчкі ў сенаце адбываліся ў наступным парадку. Першым гаварыў рэакцыйны сенатар граф дэ Блуа. Ён крытыкаваў урад і апраўдваў знешнюю палітыку Лаваля.

Старшыня замежнай камісіі сената Беранжэ папракнуў урад у тым, што ў сваёй дэкларацыі ён абышоў маўчаннем аўстрыйскае пытанне. На думку Беранжэ, мір не можа быць забяспечан без удзелу Германіі, Японіі і ЗША.

Фашысцкі сенатар Лемеры выступіў са звычайнымі нападкамі на франка - совецкі пакт.

Комуністычны сенатар Кашэн сказаў, што, не гледзячы на ўсе свае няўдачы, Ліга нацый можа яшчэ служыць справе міру.

Пасля прамовы міністра замежных спраў Дэльбоса выступіў былы прэзідэнт рэспублікі Мільеран.

Мільерану адказваў прэм'ер Блюм, які сказаў:

«Вы гаворыце, што калектыўная безапаснасць мёртва і што мы павінны пачаць новую палітыку. Мы са свайго боку адмаўляемся сказаць гэта надмагільнае слова. Наадварот, мы думаем, што няўдача санкцый павінна быць повадам для аб'яднання сіл Еўропы ў інтарэсах узмацнення безапаснасці. Узброеныя сілы Францыі не павінны быць адзіным фактарам французскай безапаснасці. Не трэба забываць аб сістэме ўзаемнай дапамогі».

Па сканчэнні спрэчак сенат прыняў 185 супроць 58 галасоў прапанаваную групай левых сенатараў формулу давер'я ўраду.

На сесіі Совета Лігі нацый

ЖЭНЕВА, 26 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння адбылося закрытае пасяджэнне Совета Лігі нацый. На пасяджэнне не прыбыла абісінская дэлегацыя ў складзе абісінскага пасланніка ў Лондане Мартына і генерала Насібу.

Было зачытана пісьмо італьянскага ўрада. Італьянскі ўрад тлумачыць, чаму ён не можа прымаць удзелу ў дыскусіі па італа-абісінскаму канфлікту і па лакарнскаму пытанню. Па запрашэнню старшыні, генерал Насібу заняў месца за сталом Совета. Затым старшыня прапанаваў, каб Совет абмежаваўся толькі канстатацыяй, што італа-абісінскі канфлікт павінен абмяркоўвацца 30 чэрвеня на пленуме Лігі. Совет згадзіўся з гэтай прапановай.

Пасля гэтага прадстаўнік Чылі Вікун'я прапанаваў адкрыць генеральную дыскусію аб рэформе Лігі, ці вызначыць камісію для вывучэння гэтага пытання. Вікун'я прыгразіў, што калі не будзе праведзена рэарганізацыя Лігі нацый, то Чылі «можа быць вымушана прыняць іншыя рашэнні».

Супроць гэтай прапановы рэзка выступіў тав. М. М. Літвінаў. Літвінаў указаў, што ён не пярэчыў бы супроць абмеркавання канкрэтных прапаноў аб рэформе Лігі нацый, але такіх няма, і ён задае сабе пытанне: ці не азначала-б прапанова прадстаўніка Чылі на справе знішчэння Лігі? Можна вызначыць камісію, сказаў Літвінаў, калі ёсць дакладныя прапановы, але нельга прымаць рэзалюцыю, якая абвяшчае, што Ліга павінна быць рэарганізавана. Затым Літвінаў заявіў, што ён не ўпэўнен у неабходнасці гэтага, або ў тым, што новая Ліга была-б лепш старой.

Пленум, па думцы Літвінава, заслухае даклады аб санкцыях, аб няўдачах Лігі нацый і аб прычынах гэтых няўдач; можа быць, пасля спрэчак знойдуць неабходным рэарганізаваць Лігу. Тав. Літвінаў лічыць, што не статут Лігі праваліўся, а што не была скарыстана зброя, прадастаўленая статутам.

Літвінава падтрымалі румынскі міністр замежных спраў Тытулеску, іспанскі міністр замежных спраў Барсіа і старшынствуючы міністр замежных спраў Англіі Ідэн, які ўказаў, што прадстаўнік Чылі можа падняць пытанне аб рэарганізацыі Лігі нацый на пленуме. Гэта рашэнне і было прынята.

Сёння ў Жэневу прыбыў абісінскі негус.

АНГЛА-СОВЕЦКІЯ АДНОСІНЫ

ЛОНДАН, 26 чэрвеня. (БЕЛТА). Тон каментарыяў англійскага друку ў адносінах пазіцыі СССР на канферэнцыі ў Мантрэ заўважна змяніўся. Большасць газет, каб выправіць ранейшыя прыстрасныя каментарыі сваіх карэспандэнтаў, змясціла заяву Літвінава прадстаўнікам друку ў Мантрэ. Увогуле падкрэсліваецца, што англа - совецкія разгалоссі ў пытанні аб пралівах могуць быць згладжаны.

Жэнеўскі карэспандэнт газеты «Морнінг пост» адзначае, што «ў розных колах рабіліся спробы ўбіць клін паміж Англіяй і Совецкім Саюзам у пытанні аб праходзе караблёў у Чорнае мора. Гэтыя спробы пацярпелі ўжо няўдачу».

Пасля адмаўлення ад санкцый супроць Італіі

РЭЗКІЯ НАПАДКІ НА АНГЛІЙСКІ ЎРАД У ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛОНДАН, 26 чэрвеня. Лідэр лейбарыстаў Этлі, унёсшы ў палату абшчын вотум недавер'я ўраду, паставіў пытанне, у чым-жа будзе заключацца знешнепалітычны курс Англіі пасля адмены санкцый. Ці будуць прымацца меры для аднаўлення супрацоўніцтва з Італіяй у Еўропе? Па словах Этлі, урад, адмовіўшыся ўзяць на сябе вядомую рызыку для забеспячэння міру, упусціў адзін выпадак стварыць магутны фронт у карысць калектыўнай безапаснасці. У рэзультаце захаванасць брытанскіх уладанняў на Далёкім Усходзе зараз залежыць ад добрай волі Японіі, а морскі шлях у Індыю—ад добрай волі Італіі.

Лідэр лібералаў Сінклер заявіў, што ўрад адмаўляецца ад санкцый якраз у той момант, калі яны становяцца эфектыўнай зброяй уздзейнічання з боку Лігі нацый. Гэта—прэмія за агрэсію.

Пасля прамоў раду дэпутатаў выступіў з вялікай заявай прэм'ер-міністр Балдуін.

Прапанова лейбарыстаў выказаць недавер'е ўраду адхілена 384 галасамі супроць 170.

ЗАЯВА АБІСІНСКАГА ПАСОЛЬСТВА

ЛОНДАН, 25 чэрвеня. (БЕЛТА). Агенцтва Райтэр паведамляе, што абісінскае пасольства апублікавала заяву, у якой указваецца, што ў часе наведвання абісінскага негуса міністрам замежных спраў Ідэнам «абмяркоўваліся розныя праблемы».

— У рэзультаце гэтага наведвання — гаворыцца ў заяве—былі даны запэўненні, што Англія прадаўжае паважаць статут Лігі нацый і не прызнае анексіі Італіяй Абісініі. Негус выказаў расчараванне па поваду рашэння англійскага ўрада зняць санкцыі і заявіў Ідэну, што намеран рашуча пратэставаць у Лізе нацый. З другога боку негус патрабуе прымянення ўсіх мер, прадугледжаных у такім выпадку статутам Лігі, які, на думку негуса, прадстаўляе адзіную гарантыю безапаснасці для вялікіх і малых краін ва ўсім свеце.

ПАДЗЕІ Ў КІТАІ

НА ПОУДНІ ПАЧАЛІСЯ ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ

ТОКІО, 26 чэрвеня. Шанхайскі карэспандэнт агенцтва «Домей Цусім», спасылаючыся на даставерныя кітайскія крыніцы, паведамляе, што авангард гуансійскіх паўднёва-заходніх войск 24 чэрвеня раптоўна атакаваў нанкінскія ўрадавыя войскі ў Хэнчжоу (правінцыя Хунань). Услед за гэтым паследваў бой, які прадаўжаўся некалькі гадзін. Нанкінскія войскі, на словах карэспандэнта, панеслі значныя страты.

ЛОНДАН, 26 чэрвеня. Ганконгскі карэспандэнт газеты «Дэйлі тэлеграф» паведамляе, што ў ноч на 24 чэрвеня гуансійскія войскі перайшлі ў наступленне. Нанкінскія войскі адступаюць. Па словах карэспандэнта, наступленне гуансійскіх войск можа даць повад Чан Кай-шы для рашучага выступлення супроць паўднёва-заходняй групоўкі. У сувязі з гэтым чакаюцца сур'ёзныя сутычкі.

Гуандунскія войскі перайшлі граніцу правінцыі Фуцзянь.

ЗА ШТО ЗВОЛЕН ВАЯВОДА СТАЖЫНСКІ?

ВАРШАВА, 26 чэрвеня. (БЕЛТА). Газета «Кур'ер подзенны», паведамляе аб раптоўным звальненні ў адстаўку выконваючага абавязкі станіславаўскага ваяводы Стажынскага Повад да адстаўкі наступны: «У горадзе Стрый (горад у Станіславаўскім ваяводстве) успыхнула забастоўка ў чыгуначных майстэрнях. Ваявода Стажынскі, прыбыўшы ў Стрый, завязаў з бастуючымі перагаворы, схіляючы іх да спынення забастоўкі.

Прэм'ер Славой-Складкоўскі, даведаўшыся аб гэтым, палічыў паводзіны Стажынскага няправільнымі, выходзячы з прынцыпу, што з дзяржаўнымі служачымі нельга весці ніякіх перагавораў. На гэтай падставе Славой-Складкоўскі зняў Стажынскага з пасады».

ПАМЕРЛА ПАРАШУТЫСТКА ТАВ. Н. БАБУШКІНА

ЙОШКАР-ОЛА, 27 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння ў 9 гадзін 10 мін. раніцы ў абласной больніцы памерла парашутыстка - ордэнаноска тав. Н. Бабушкіна, атрымаўшая цяжкія ўшыбы пры прыжку з самалёта 24 чэрвеня ў Йошкар-Ола, на масавым свяце, прысвечаным 15-годдзю Марыйскай аўтаномнай вобласці.

АД КАМІСІІ ПА ПРЫЕМЦЫ ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ І ПЕРАПІСКІ А. М. ГОРКАГА

Створаная пастановай ЦК ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза ССР ад 18 чэрвеня г. г. камісія па прыёмцы літаратурнай спадчыны і перапіскі А. М. **Горкага** зварачаецца да ўсіх устаноў і прыватных асоб, якія маюць пісьмы, рукапісы з праўкамі А. М. Горкага, уласнаручныя артыкулы і заметкі А. М. Горкага, перадаць іх у камісію.

Па ўсіх справах і пытаннях збірання і перадачы матэрыялаў у камісію зварачацца асабіста ці пісьмова па адрасу: Масква, Малая Нікіцкая, 6, камісія па прыёмцы літаратурнай спадчыны і перапіскі А. М. Горкага, сакратарыят камісіі.

Камісія па прыёмцы літаратурнай спадчыны і перапіскі А. М. Горкага.

СПРАВА БЫЛЫХ РАБОТНІКАЎ СОВЕТА ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ УКРАІНЫ

КІЕЎ, 27 чэрвеня. (БЕЛТА). Вярхоўны суд УССР вынес прыгавор па справе былых работнікаў совета прафесіянальных саюзаў Украіны, абвінавачваемых у растратах, машэнніцтве, разбазарванні дзяржаўных сродкаў і спекуляцыі курортнымі пуцёўкамі. Галоўныя абвінавачваемыя — Краўчанка, Дуброўскі і Сінельнікаў — прыгавораны да вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу з канфіскацыяй усёй маемасці.

Аграновіч (былы галоўбух), Валынскі (былы упаўнаважаны будаўнічага ўпраўлення совета профсаюзаў Украіны) і Будніцкі (былы нам. старшыні праўлення жылбудкона «Профработнік») прыгавораны да 10 год пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях Саюза з канфіскацыяй маемасці і паражэннем у правах на 5 год пасля адбыцця пакарання. Іншыя падсудныя прыгавораны да розных тэрмінаў зняволення.

50 мільёнаў пазыкатрымальнікаў

Масавыя совецкія пазыкі адыгрываюць велізарную ролю ў социялістычным будаўніцтве. Выпуск кожнай пазыкі совецкім урадам нязменна сустракае найшырэйшае падтрыманне совецкага народу. Гэта зразумела. Кожны працоўны ведае і бачыць, куды ідуць сродкі ад пазык. Яны ідуць на будаўніцтва новых прадпрыемстваў, школ, бальніц, дзіцячых устаноў, жылых дамоў, на паляпшэнне матэрыяльнага становішча саміх працоўных, на ўмацаванне абароны краіны.

Пачынаючы з 1929 г., совецкім урадам было выпушчана 7 масавых пазык. Колькасць пазыкатрымальнікаў нязменна расце.

У 1929 г. у нас было 10 мільёнаў пазыкатрымальнікаў, у 1930 г. — 12 мільёнаў, у 1931—33 мільёны, у 1932 г. — 40 мільёнаў, у 1934 г. — больш 45 мільёнаў і ў 1935 г. — каля 50 мільёнаў. На руках у насельніцтва ёсць 860 мільёнаў штук аблігацый.

За гады першай пяцігодкі пазыкатрымальнікі СССР атрымалі даходаў па дзяржаўных пазыках і ў парадку пагашэння аблігацый 853 млн. 800 тысяч рублёў. За тры гады другой пяцігодкі выплачана пазыкатрымальнікам у выглядзе працэнтаў, выйгрышаў, пагашэння кошту аблігацый — 2 мільярды 572 мільёны 400 тысяч рублёў.

З года ў год растуць укладанні ў капітальнае будаўніцтва. У гэтым велізарную ролю адыгрываюць сродкі, паступаючыя ад пазык. У 1935 г. у капітальнае будаўніцтва ўкладзена 24 мільярды 15 мільёнаў рублёў. Ад пазык на капітальнае будаўніцтва паступіла ў 1935 годзе 3 мільярды 757 мільёнаў рублёў.

(«Р. М.»).

НЕАБХОДНАЯ СПРАВА

Прачытаў я ўчора ў «Известиях» заметку: «Назревший вопрос». Аўтар ставіць пытанне аб неабходнасці выпуску аблігацый большых купюр, чым дагэтуль, і аб аб'яднанні ўсіх выпушчаных пазык у адну. Я лічу гэтыя прапановы вельмі карыснымі і своечасовымі.

Вось у мяне ёсць шмат аблігацый з пяцірублёвымі купюрамі, іх не правяраеш, на іх не зварачаеш увагі, бо гэтых «пяцірублёвак» занадта многа. І згубіць іх лёгка. А колькі часу ідзе на іх праверку!

Па-мойму, трэба выпусціць пазыку купюрамі ў 25, 50 і 100 рублёў. Гэта будзе выгадней і дзяржаве і пазыкатрымальнікам.

Вялікае значэнне мае таксама абмен усіх аблігацый выпушчаных пазык на адну пазыку. У пазыкатрымальнікаў накапіліся аблігацыі многіх пазык на тысячы рублёў. Яны дастаўляюць нямала клопатаў трымальніку. Кожны год адбываецца столькі тыражоў, што не паспяваеш сачыць за ўсімі. І я ўпэўнен, што ў кожнага з нас ёсць неправераныя аблігацыі. Асаблівая блытаніна з аблігацыямі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» і «3-я пазыка індустрыялізацыі». Колькі разоў я сам памыляўся з-за гэтага: здавалася, што выйграў, а на справе— не... Трэба аб'яднаць усе гэтыя пазыкі. І дзяржаве будзе карысць і нам зручней.

І, нарэшце, трэцяе пытанне. Совецкі рубель умацаваўся, дзяржаўны крэдыт патанеў. Трэба знізіць процанты, выплачваемыя пазыкатрымальнікам. Дзяржава зэканоміць на гэтым мільёны рублёў, якія пойдуць на социялістычнае будаўніцтва.

Рабочы-ордэнаносец
П. АНТАШКЕВІЧ.

СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД НАРКОМА ФІНАНСАЎ БССР У НАРКАМФІНЕ САЮЗА ССР

19 чэрвеня народны камісар фінансаў Саюза ССР тав. Г. Ф. Грынько заслухаў справаздачны даклад наркома фінансаў Беларускай ССР тав. І. Ф. Кудзелька аб рабоце фінорганаў БССР за 1935 год і першы квартал 1936 г. У пасяджэнні прымалі ўдзел кіруючыя работнікі Наркамфіна СССР, нарком фінансаў РСФСР тав. В. М. Якаўлева, адказныя супрацоўнікі Наркамфіна БССР, прадстаўнік падшэфнай Наркамфіну БССР вайсковай часці РСЧА—член ЦВК СССР тав. П. М. Ушакоў і старшыня Цэнтральнага праўлення саюза фінансава-банкаўскіх работнікаў Беларусі тав. Б. З. Гераўкер.

У спрэчках па дакладу прыняла ўдзел 12 чалавек. У канцы пасяджэння з кароткім словам выступіў нарком фінансаў Саюза ССР тав. Г. Ф. Грынько.

(«З. Ж.»).

ПАВЕДАМЛЕННІ

28 чэрвеня, роўна ў 2 гадзіны дня, у памяшканні Дома тэхнікі (Комсамольская, 25) склікаецца нарада сакратароў парткомаў і парторгаў Кагановіцкага раёна.

Яўка ўсіх вышэйпаказаных абавязкова і без спазненняў.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

РОСТ ДАХОДАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗЫКАХ.

Па СССР	Па БССР
1933 г.—550 млн. р.	1933 г.—12 439.000 р.
1934 г.—925 млн. р.	1934 г.—17.680.000 р.
1935 г.—1 мільярд 300 мільёнаў р.	1935 г.—21.351.000 р.
1936 г.—1 мільярд 800 мільёнаў р.	На 1 мая 1936 г.—8.780.000 р.

У АШЧАДКАСАХ

МАГІЛЕЎСКІ МЕДПОЛІТЭХНІКУМ,

які рыхтуе фельчароў, акушорак і фармацэўтаў,

абвяшчае АСЕННІ НАБОР студэнтаў

на 1936—37 навучальны год на наступныя аддзяленні:

1) Акушорскае, з аднагадовым курсам навучання (курсы) — 70 чал.
2) Акушорскае, з 2-гадовым курсам навучання 180 »
3) Фельчарскае, з 3-гадовым курсам навучання 210 »
4) Фармацэўтычнае, з 3-гадовым курсам навучання 120 »

Прыём заяў — да 15 жніўня.

Да заяў трэба прыкласці:

метрычны выпіс;

атэстат аб сканчэнні няпоўнай сярэдняй школы;

даведку ад лекавай установы аб тым, што стан здароўя паступаючага не перашкаджае паступленню ў медыцынскія навучальныя ўстановы;

аўтабіяграфію і дзве фотакарткі, засведчаныя дзяржустановай з уласнаручнымі подпісамі на іх;

паштовых марак на 80 кап.

Апрача гэтага паступаючыя ва ўзросце ад 16 год і вышэй прад'яўляюць свой пашпарт (асабіста).

Заявы прымаюцца ад асоб ва ўзросце ад 15 да 35 год; на акушорскае аддзяленне — з 2-гадовым курсам навучання — ад 16 год і з аднагадовым курсам навучання — 17 год.

Іспыты адбудуцца па матэматыцы, фізіцы, палітграмаце, белмове, рускай мове і геаграфіі за курс няпоўнай сярэдняй школы ў перыяд з 15 да 25 жніўня.

Без выкліку на іспыты падаўшыя заявы не павінны з'яўляцца.

Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам і сталоўкай.

Стыпендыяй студэнты забяспечваюцца па паспяховасці ад 60 да 80 руб. у месяц.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Магілеў на/Д. медполітэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДЗЯРЖЦЫРК

(Сад „Профінтэрн“)

Тэл. 25-085 і 24-171

СЁННЯ, 28 чэрвеня,

АДКРЫЦЦЕ ЦЫРКА

вялікае прадстаўленне ў 3-х аддзяленнях.
У праграме — лепшыя совецкія і замежныя нумары і атракцыёны.

Адкрыт продаж пастаянных месц.
Прымаюцца заяўкі на мэтавыя прадстаўленні.
КАСА цырка адкрыта з 12 да 2 і з 5 да 10 г. веч.

Памяшканне БДТ-1

Ад 5 ліпеня

гастролі Маскоўскага дзяржаўнага цэнтральнага тэатра рабочай моладзі

РЭПЕРТУАР:

5 ліпеня	6 ліпеня	7 ліпеня
А. Бруштэйн.	А. Астроўскі	А. Арбузаў
ПРОДОЛЖЕНИЕ СЛЕДУЕТ	БЕДНОСТЬ НЕ ПОРОК	ДАЛЬНЯЯ ДОРОГА

Папярэдні продаж білетаў з 1 ліпеня. Падрабязнасці ў афішах.

28 чэрвеня, у 2 гадзіны дня, у клубе імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай вуліц)

горфінаддзел і горашчадкаса

СКЛІКАЮЦЬ

НАРАДУ

галоўных (старшых) бухгалтараў і бухгалтараў, узначальваючых разліковыя часткі ўсіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый гор. Менска.

Своечасовая яўка ўсіх выклікаемых на нараду абавязкова.

Кіраўнікам устаноў, старшыням ФЗМК у сувязі з важнасцю пытання забяспечыць яўку выклікаемых на нараду.

Уваход па білетах, атрыманых у ашчадкасе № 16.

МЕНГАРФА. ГОРАШЧАДКАСА

Памяшканне Белдзяржтэатра

Гастролі харкаўскага дзяржаўнага украінскага тэатра імя Т. Г. ШЭЎЧЭНКА (б Бярэзіль)

Карпенка-Карый

28 чэрвеня

МАРТЫН БОРУЛЯ

Пачатак у 8 г. веч.

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»	ГУЛЬНЯ Ў ЛЮБОЎ
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР	Лунны камень Экстраны выпуск Саюзкінохронікі „МАКСІМ ГОРКІ“
«ПРОЛЕТАРЫЯ»	ЕГІТ
«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»	ПЕТЭР
„СПАРТАК“	ПАЭТ І ЦАР

Менскаму райвыканкому

ПАТРЭБНА

вопытная МАШЫНІСТКА,

ведаючая добра беларускую мову. Даведацца аб умовах: Карла Маркса, 16, пакой № 3, або па тэл. № 25-843.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Даводзіцца да ведама ўсіх устаноў і арганізацый,

што ў адпаведнасці з пастановай СПА ад 27 красавіка 1936 г. і загадаў НКЦП ад 7 мая 1936 г. і ГУТАП'а ад 8 мая 1936 г. аб зліянні «ВАТАЗБЫТА» і «ВАТАЗАПЧАСЦЬЗБЫТА» у адзіную арганізацыю па збыту прадукцыі аўтатрактарнай прамысловасці «Аўтатрактаразбыт», БЕЛ. АДДЗЯЛЕННЕ «ВАТАЗБЫТ» і «ВАТАЗАПЧАСЦЬЗБЫТ» з 1 ліпеня 1936 г. ЗЛІВАЮЦЦА Ў АДНУ СІСТЭМУ

Бел. аддзялення дзяржаўнай Усесаюзнай канторы

„АЎТАТРАКТАРАЗБЫТ“

На тэрыторыі БССР з гэтага чысла функцыянуюць:

1. Бел. аддзяленне «Аўтатрактаразбыт», — гор. Менск, Суражская вул. № 10. тэл. № 20-862, 23-941.
2. Менская база — гор. Менск. Гандлёвая вул. 29. тэл. 20-925.
3. Аршанская база — г. Орша, Комунальны зав. № 46, тэл. 1-55.
4. Гомельская база — г. Гомель. Совецкая пл. № 1, тэл. 9-59.
5. Віцебскае агенцтва — г. Віцебск, Шасейная № 14, тэл. 6-09.

МЕНСКАЯ БАЗА абслугоўвае раёны:
Менскі, Смалявіцкі, Барысаўскі, Бягомльскі, Плешчаніцкі, Лагойскі, Заслаўскі, Дзяржынскі, Уздзенскі, Капыльскі, Грэскі, Слуцкі, Чырвонаслабодскі, Старобінскі, Любаньскі, Старадарожскі, Глускі, Парыцкі, Бабруйскі, Кіраўскі, Клічаўскі, Бярэзінскі, Асіпавіцкі, Пухавіцкі, Чэрвеньскі і Смілавіцкі.

ГОМЕЛЬСКАЯ БАЗА абслугоўвае раёны:
Гомельскі, Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Дамашавіцкі, Добрушскі, Ельскі, Жлобінскі, Жыткавіцкі, Капаткевіцкі, Камарынскі, Кармянскі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Прапойскі, Петрыкаўскі, Рэчыцкі, Тураўскі, Цэрахаўскі, Уваравіцкі, Хойніцкі, Чачэрскі, Свяцілавіцкі і Журавіцкі.

АРШАНСКАЯ БАЗА абслугоўвае раёны:
Аршанскі, Магілеўскі, Талачынскі, Крупскі, Касцюковіцкі, Клімавіцкі, Крычаўскі, Чырвонапольскі, Бялыніцкі, Багушэўскі, Горацкі, Дрыбінскі, Дубровенскі, Круглянскі, Лепельскі, Мсціслаўскі, Сенненскі, Халопеніцкі, Чашніцкі, Чавускі, Шклоўскі, Рагачоўскі, Хоцімскі, Чэрыкаўскі і Быхаўскі.

ВІЦЕБСКАЕ АГЕНЦТВА абслугоўвае раёны:
Віцебскі, Бешанковіцкі, Ветрынскі, Гарадоцкі, Асвейскі, Дрысенскі, Лёзнянскі, Мехаўскі, Полацкі, Расонскі, Суражскі, Сіроцінскі і Ушацкі.

За атрыманнем запасных частак належыць зварачацца на ўказаныя пункты.

БЕЛ. АДДЗЯЛ. «АЎТАТРАКТАРАЗБЫТ».

ШТО МОЖНА ПРЫГАТАВАЦЬ З ПАВІДЛА

У кілограме павідла 2700 калорый — амаль столькі, колькі ў 300 грамах масла. Такая высокая каларыйнасць павідла даўно заслужыла яму шырокую вядомасць і яно ў сучасны момант з'яўляецца найбольш папулярным і распаўсюджаным відам садовых кансерваў.

Што-ж такое павідла? Гэта рэдкі мармелад, які ўяўляе сабой тонка змельчаную мякаць садавіны, якая ўгатавана з дабаўленнем цукру. Пры гэтым трэба заўважыць, што ў павідле ёсць не менш 60 проц. цукру. Вось адкуль бярэцца такая высокая пажыўнасць і лёгкая засваяльнасць гэтага прадукту.

Гэтаму-ж спрыяе і наяўнасць натуральнага пладовага цукру і натуральных смакавых араматычных вяшчэстваў, якія ўласцівы свежай садавіне. У выніку сваёй высокай каларыйнасці павідла моцна ўвайшло ў пастаянны харчовы рэжым насельніцтва і з'яўляецца незаменімым снеданнем для дзяцей і дарослых.

Павідла, згатаванае на заводах Галоўкансерва, адрозніваецца ад павідла саматужнай выпрацоўкі тым, што яно варыцца ў вакуумапаратах; гэта абставіна забяспечвае захаванне натуральнага смаку і арамату перапрацоўваемых пладоў і садавіны і спрыяе захаванню вітамінаў у гатовых прадуктаў.

Апрача таго павідла заводскага прыгатавання пазбаўлена якіх-бы там ні было дабаўленняў у відзе штучнай эсенцыі і фарбаў. Уся вытворчасць павідла знаходзіцца пад непасрэдным хіміка-бактэрыялагічным кантролем заводскіх лабараторый.

Усе працэсы вытворчасці — мыццё садавіны, апарванне, змяльчэнне і зняцце скуры і насення — поўнасцю механізаваны, што забяспечвае належныя санітарна-гігіенічныя ўмовы вытворчасці.

Каштоўныя смакавыя ўласцівасці, якімі валодае павідла, дазваляюць скарыстоўваць яго ў якасці танных ласункаў, а таксама ў якасці прыправы, якая значна паляпшае смак другіх харчовых прадуктаў; так, напрыклад, хлеб з павідлам — пажыўнае і смачнае снеданне для дзіцяці і дарослага.

Наяўнасць значнага процанта цукру спрыяе працяжнаму хаванню павідла і дае магчымасць выпрацоўляць у любы час года фруктовыя кісялі, мусы, падліўкі для пудзінгаў і кашы, начынкі для піражкоў і піражных і т. д.

Павідла, якое ідзе для вырабу гэтых блюд, пазбаўляе ад неабходнасці чысткі, варкі і змяльчэння садавіны.

Выпрацоўваючы кісялі і падліўкі, трэба папярэдне разбавіць 50 грам павідла ў шклянцы вады і нагрэваць яе да кіпення.

САЮЗКАНСЕРВЗБЫТ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Тыраж 90.550 экз.
Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.
Уп. Галоўлітбела № К—144.